КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 17 (193)
◂ 7 МАЯ ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ЦІХІЯ ГЕРОІ АКУПАЦЫІ

Стар. 14–15

**СВАБОДА, ПРЭСА І АПОСУМ**

Сусветны дзень свабоды прэсы Беларусь сустрэла ў чаканні разгляду Саветам міністраў праекта пастановы аб рэгламентацыі дзейнасці электронных СМІ

Стар. 4

**СМЕРЦЬ «АДЗІНАГА»**

За паўгода да прэзідэнцкіх выбараў пра свой намер балатавацца заявілі ўжо чатыры кандыдаты ад апазіцыі, а таксама дзеючы кіраўнік Беларусі

Стар. 6

**АГОНІЯ ПОЛЬСКАГА «ЛУКАШЫЗМУ»**

Стар. 12

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**БЕЛАРУСКІ ДАРЭНДОРФ**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПА ГОДУ ЗА ПАТРОН

Вольга ХВОІН

**Вярхоўны суд вынес вердыкт па гучнай справе Мікалая Аўтуховіча. Праваабаронца Алег Воўчак, які назіраў за працэсам, заявіў, што вынік судовага следства — частковая маральная і палітычная перамога грамадскай супольнасці, СМІ, праваабаронцаў.**



6 мая Вярхоўны суд прыгаварыў Мікалая Аўтуховіча да пяці гадоў і двух месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму за незаконнае набыццё і захоўванне зброі і боепрыпасаў — пяці патронаў да паляўнічай вінтоўкі. Уладзімір Асіпенка асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму за захоўванне і перавозку зброі і выбуховых рэчываў. Былы работнік фірмы Аўтуховіча Аляксандр Ларын і падпалкоўнік міліцыі Міхаіл Казлоў атрымалі тры гады ў калоніі ўзмоцненага рэжыму і два гады ў калоніі агульнага рэжыму без пазбаўлення права займаць кіруючыя пасады адпаведна.

Галоўны вынік працэсу: суд зняў з Аўтуховіча і Асіпенкі абвінавачанні ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта ў дачыненні да намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Каменкі і былога старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі, а таксама ў арганізацыі падпалу дома экс-начальніка Ваўкавыскага РАУС Сяргея Кацубы ў 2004 годзе.

Для Беларусі крымінальная справа аб падрыхтоўцы тэракту — інфармацыйная «бомба», якую ўлады маглі б выкарыстоўваць у стварэнні чарговых кампраментуючых матэрыялаў супраць нязгодных з дзеючым рэжымам асобаў. Аднак падчас адкрытага судовага разгляду (на гэтым настойвалі праваабаронцы) стала зразумела, што доказная база рассыпаецца на вачах. Пракурор патрабаваў для Аўтуховіча 20 гадоў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці, для Асіпенкі і Ларына — 11 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, для Казлова — тры гады калоніі агульнага рэжыму без права займаць кіруючыя пасады.

З боку праваабаронцаў, журналістаў незалежных СМІ першапачаткова была вялікая ўвага да гэтай справы, пазней далучылася міжнародная супольнасць, дыпкорпус. Пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан прысутнічаў у залі суда і так пракаментаваў вердыкт: «Для мяне важна, што знялі самыя цяжкія абвінавачанні — у падрыхтоўцы тэракта. Засталося толькі абвінавачанне ў незаконным захоўванні зброі, а яно трымаецца толькі на падставе паказанняў Ларына, якія суд прызнаў супярэчлівымі. І ўсё ж падаецца, што пяць гадоў зняволення за такое абвінавачванне — вельмі вялікі тэрмін».

«Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка і Міхаіл Казлоў — не партызанскі атрад, а група аднадумцаў, якая расследавала карупцыйныя справы ў рэгіёне, — лічыць праваабаронца Алег Волчак. — Падчас працэсу ў Вярхоўным судзе яны паказалі, што карупцыя пранікла ў самыя неверагодныя месцы, а менавіта ў падатковую сістэму. Яна зарабляе грошы для вертыкалі, то бок, як высветліў Аўтуховіч, частка грошай ідзе на абслугоўванне мясцовых чыноўнікаў, а частка — на іншыя патрэбы. Калі ў Аўтуховіча развіўся бізнес, яму сказалі: «Ты мусіш плаціць». Ён адмовіўся, і пасля пачаліся праблемы».

Па словах Волчака, Аўтуховіч раскрыў «крышаванне» бізнесу чыноўнікамі ў Гродзенскай вобласці. Размова ідзе пра падатковага інспектара Стасевіча, начальніка міліцыі Кацубу, старшыню гарвыканкаму Савельева, губернатара Брэсцкай вобласці Сумара ды іншых. «Улады напалохаліся, што гэтых людзей не спыніць, таму ім былі прад'яўленыя такія тэрміны. Гэтыя людзі раскрылі ценявую эканоміку, на якой трымаецца ўлада. Падчас працэсу да мяне падыходзілі людзі і гаварылі, што такое ж адбываецца ў іншых рэгіёнах Беларусі», — расказвае Алег Волчак.

Міхаіл Казлоў, па ацэнках Мікалая Аўтуховіча і праваабаронцаў, патрапіў за краты таму, што не пагадзіўся гуляць па правілах дзяржавы і пачаў займацца расследаваннем карупцыйных спраў. «Асіпенка сказаў пра Казлова: «Гэта не мент, а супрацоўнік міліцыі». Канешне, ён не змог адзін раскруціць гэту праблему і ў выніку патрапіў на лаву падсудных», — зазначае праваабаронца Волчак. Падпалкоўнік міліцыі Міхаіл Казлоў з'яўляецца былым кіраўніком упраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю па Гродзенскай вобласці. Яго прызналі вінаватым у тым, што ведаў пра магчымыя супрацьпраўныя дзеянні, аднак не прыняў захадаў, каб іх прадухіліць.

Праваабаронцы выказваюць перасцярогі наконт бяспекі жыцця абвінавачваемых: «У турме супраць Мікалая Аўтуховіча можа быць ужытая нейкая правакацыя, ён можа «ўпасці», ці здарыцца бойка са зняволенымі, ці раптоўны сардэчны прыступ — і мы нічога не зможам даказаць», — падкрэслівае Алег Волчак.

Што тычыцца Аляксандра Ларына, на паказаннях якога і грунтавалася абвінаваўчая база, то праваабаронцы заклікаюць не ацэньваць яго паводзіны адназначна адмоўна. «Мы не ведаем, што прымусіла гэтага чалавека так сябе паводзіць, набрацца нахабства ўмяшацца ў жыццё іншых людзей, абгаварыць іх, даваць такія паказанні, не ведаем усіх акалічнасцяў, таму Ларын такі ж кліент праваабаронцаў, як і астатнія фігуранты справы», — зазначае юрыст Алеся Мураўёва, прадстаўніца ініцыятывы «Прававая дапамога насельніцтву».

Працяг на стар. 4 ▸

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЛЕЙКА. СУПРАЦІЎ ПАШЫРАЕЦЦА

1 мая адбыўся круглы стол па праблеме будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Астравецкім раёне. Вядучы Алесь Капуцкі распавёў, што гэткія круглыя сталы ладзяцца і ў іншых месцах рэгіёна — у Маладзечна, Смаргоні, Мядзелі. Бо ўсе гэтыя раёны суседнічаюць з пляцоўкай будаўніцтва АЭС, і праблема будаўніцтва станцыі непасрэдна датычыць усіх жыхароў. Галоўнай персонай на мерапрыемстве быў спецыяльна запрошаны эксперт, прафесар Георгій Лепін. Фізік па адукацыі, ён мае вялікі досвед працы ў галіне атамнай энергетыкі. У свой час ён працаваў на прадпрыемстве па вырабу рэактараў, а пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС шмат гадоў прысвяціў працы ў забруджанай зоне, не далей за 3 кіламетры ад ЧАЭС. Па словах Георгія Лепіна, за час сваёй працы ў гэтай галіне ён прыйшоў да высновы, што атамная энергетыка з'яўляецца вельмі шкоднай і нявыгаднай рэччу.

### ГЛЫБОКАЕ. КАНГРЭС ЛЕГІЯНЕРАЎ

У касцёле Святой Тройцы адбыўся I кангрэс Легіёна Марыі. Тэма кангрэса: «Легіянер і Эўхарыстыя». На кангрэс сабраліся 55 легіянераў і духоўныя кіраўнікі.

Легіён Марыі — гэта супольнасць католікаў, якія выбралі Беззаганную Панну Марыю як найкарацейшы шлях да святасці і збаўлення. Мэта Легіёна Марыі — праслаўленне Бога і асвячэнне легіянераў праз штотыднёвыя малітоўныя сустрэчы і практычнае выкананне апостальскай працы. Легіянер кожны дзень чытае абавязковую малітву (tessera). У духоўным жыцці легіянераў важную ролю адыгрывае ружанцовая малітва. Легіянеры Марыі наведваюць шпіталі, дамы састарэлых. Трымаючыся Беззаганнай Маці і наследуючы Яе пакору, яны ідуць з Ёю на заданне, каб кожную душу прывесці да Хрыста. Гэты апостальскі рух узнік 7 верасня 1921 года, на свята Нараджэння Беззаганнай Панны Марыі, у Ірландыі.

### СВЕТЛАГОРСК. ПЯШЧОТНАЕ СЭРЦА

У гарадскім цэнтры культуры Светлагорску быў паказаны чаргова спектакль народнага тэатра «Спадчына». Гэта камедыя-вадэвіль пра каханне. Спектакль сабраў поўную залу гледачоў — прыхільнікаў творчасці мясцовых артыстаў. Яны пабачылі інсцэніраваны твор расійскага пісьменніка Уладзіміра Салагуба «Бяда ад пяшчотнага сэрца». Прафесійных акцёраў у тэатры практычна няма, а трупа складаецца з настаўнікаў, выхавацеляў, слесараў і нават пенсіянераў. Аднак спектакль атрымаўся, гледачы засталіся задаволеныя.

### ЧАЧЭРСК. ГУЧАЛІ ТВОРЫ АГІНСКАГА

2 мая ў чацвёрты раз адбылося свята беларускай музыкі «Чачэрскія сустрэчы». Яно было прысвечана 245-годдзю са дня нараджэння Міхаіла Клеафаса Агінскага. На «Сустрэчы» гучалі выключна творы слыннага кампазітара, у тым ліку яго знакамітая «Развітанне з Радзімай». Па традыцыі, у фестывалі прымаў удзел Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

СМІ

# ЛАЎРЭАТЫ «ВОЛЬНАГА СЛОВА»

**Генадзь КЕСНЕР**

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» 3 мая, у Сусветны дзень свабоднай прэсы, уганаравала пераможцаў і прызёраў конкурсу «Вольнае слова». Гэты конкурс БАЖ ладзіць з 2007 года, і ў ім ужо ўзялі ўдзел дзесяткі беларускіх журналістаў, што працуюць як у незалежных, так і ў дзяржаўных масмедыя.**



Варта адзначыць, што ў журы конкурсу ўваходзілі такія вядомыя майстры пяра і мікрафона, як Таццяна Мельнічук, Юлія Слуцкая, Андрэй Аляксандраў, Анатоль Гуляеў, Максім Жбанкоў, Аляксандр Старыкевіч, Андрэй Скурко, а старшынёй журы ўжо не першы год з'яўляецца Юрась Карманаў.

Адзін з лаўрэатаў — рэдактар навін найбуйнейшага беларускага парталу TUT.BY Кастусь Лашкевіч быў уганараваны двойчы: ён стаў пераможцам у намінацыі «Найлепшая аналітычная публікацыя» з артыкулам «Беларусь вачыма шведаў: «Сэрца, якое б'ецца і краваточыць», а ў намінацыі «Найлепшы інфармацыйны матэрыял» публікацыя Кастуся Лашкевіча «Страчаная сталіца. Дапаможнік-гід па беларускай Вільні» заняла другое месца.

Кастусь Лашкевіч асобна падзякаваў за спрыянне амбасадару Швецыі ў Беларусі Стэфану Эрыксану і паведаміў: «Частку сваёй прэміі за другое месца я збіраюся перадаць на будаўніцтва помніка першаму каралю Вялікага княства Літоўскага Міндоўгу ў Навагрудку, а прэмію за першае месца — на лячэнне хворых дзяцей, на якое мы збіраем грошы на нашым дабрачынным блогу www.help.blog.tut.by».

Што да іншых лаўрэатаў, то ў намінацыі «Найлепшы інфармацыйны матэрыял» перамагла Святлана Станкевіч («Салідарнасць») з публікацыяй «Чым Грозны падобны на Мінск», а трэцяе месца заняла праца Глеба Лабадзенкі («Звязда») пад назвай «І мама кажа: нешта ў цябе, дачка, жывот падазрона расце».

У намінацыі «Найлепшая аналітычная публікацыя» другое месца заняла Святлана Цішко («Рэгіянальная газета») з артыкулам «Няўжо ў нябыт?», а трэцяе месца — у Святланы Гарды («Intex-press») за публікацыю «Здабытчыкі ідуць на справу».

У намінацыі «Найлепшая публікацыя мастацка-публіцістычнага жанру» перамагла Анжэла Белуш («Intex-press») з працай «Напішыце: інвалідам уваход забаронны», на другім месцы — Руслан Гарбачоў («Салідарнасць») з працай «Вандроўка па Сярэдняй Азіі», на трэцім — Наталля Семяновіч («Intex-press») — з артыкулам «Гэта мая праца: судмедэксперт».

У намінацыі «Дэбют» была адзначана праца «На Падляшшы назвы мясцовасцей пішуць па-беларуску» Хрысціны Марчук («Газета Слонімская»), а ў намінацыі «Журналісцкае расследаванне» — карэспандэнт «Звязды» Яўген Валошын за публікацыю «У Беларусі легальна прадаюць наркотыкі?»

***P.S.*** *Сродкі на помнік можна пералічыць на рахунак: Аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама, 231400, Навагрудак, вул. Міцкевіча, 9а, р/с 3632000001310 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 698, УНП 500031377, ОКПО 02234044. З пазнакай «На помнік Міндоўгу»).*

СУД

# ЗНОЎ «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ»

**12 мая ў гаспадарчым судзе Мінска пачнецца разгляд справы аб спагнанні 249 мільёнаў рублёў з царквы «Новае жыццё» Рэлігійнага аб'яднання абшчын хрысціян поўнага Евангелля ў Рэспубліцы Беларусь.**

Паводле слоў юрыста абшчыны Сяргея Луканіна, суд распачаў справу па іску камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мінгарвыканкама. Луканін нагадаў, што ў снежні 2009 года камітэт запатрабаваў ад царквы на працягу двух месяцаў пакрыць урон прыродзе на суму каля 263 мільёнаў рублёў. «Аднак пасля патрабаванні чыноўнікаў скараціліся на 14 мільёнаў рублёў», — сказаў юрыст.

Ён не выключае, што 12 мая суддзя сталічнага гаспадарчага суда Алег Клюйко вынесе рашэнне па справе.

Луканін назваў дзеянні чыноўнікаў Мінгарвыканкама «сродкам эканамічнага націску на рэлігійную абшчыну». На думку юрыста, «менавіта прыродаахоўнае ведамства Мінгарвыканкама абрана сродкам расправы з царквой, паколькі чыноўнікі-экологі могуць накладаць вельмі адчувальныя штрафныя санкцыі».

Луканін паведаміў, што згодна з лістом камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мінгарвыканкама, 4 мая ў 11.00 з удзелам прадстаўнікоў абшчыны павінна была адбыцца праверка тэрыторыі царквы на прадмет знішчэння верхняга ўрадлівага пласта глебы. «Менавіта так чыноўнікі назвалі добраўпарадкаванне тэрыторыі для дзіцячай пляцоўкі», — адзначыў юрыст. Аднак, паводле яго слоў, праверка не адбылася, хаця да будынка царквы прыбыла машына з трыма чыноўнікамі, якія неўзабаве паехалі. Свае дзеянні яны матывавалі адсутнасцю спецыялістаў іншых ведамстваў, сказаў Луканін.

У канцы мінулага года супрацоўнікі камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выявілі сляды нафтапрадуктаў у пробах, узятых на праезнай частцы дарогі каля будынка царквы, і інтэрпрэтавалі гэта як забруджванне навакольнага асяроддзя. Як сцвярджае Луканін, пры адборы пробы грунту не прысутнічалі пастары і прадстаўнікі абшчыны. Тэрыторыя вакол царквы раней выкарыстоўвалася калгасам імя Калініна для сельгасвытворчасці, а затым на ёй размяшчалася несанкцыянаваная звалка прамысловых адходаў з каркасамі і рухавікамі аўтамабіляў.

**БелаПАН**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ФЕСТЫВАЛЬ ЕЎРАПЕЙСКАГА КІНО

**Вольга ХВОІН**

**Пасольствы краін Еўрапейскага саюза зладзяць у Беларусі фестываль кінамастацтва. Фэст распачнецца 10 мая, на наступны дзень пасля Дня Еўропы. Яго мэта — прыцягнуць увагу да агульнай культурнай спадчыны, а таксама разбурыць у беларусаў стэрэатыпы, звязаныя з пэўнымі краінамі.**

Увазе гледачоў будуць прапанаваныя семнаццаць фільмаў розных жанраў — ад казак да гістарычных драм — з шаснаццаці краін: Беларусі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Германіі, Даніі, Італіі, Ірландыі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Фінляндыі, Францыі, Чэхіі, Швецыі і Эстоніі. Фэст адкрые беларуская стужка «Рака жыцця», якая будзе паказаная 10 мая ў кінатэатры «Перамога» ў Мінску.

Дырэктарка кінатэатра «Перамога» Святлана Саўчык расказала, што беларускі бок не здолеў знайсці поўнаметражнага фільма, знятага за апошнія гады, які мог бы годна прэзентаваць Беларусь на гэтым фэсце, перадаваць атмасферу краіны. Але выйсце было знойдзенае: «Рака жыцця» — дакументальны фільм, які распавядае пра нашу прыроду, прэзентуе Беларусь як рачную краіну. Яе рэжысёр Ігар Бышнеў цяпер у супрацоўніцтве з аўстрыйцам Клаўсам Файхтэнбергам здымае стужку з працоўнай назвай «Ваўкі Чарнобыля». Праект рэалізуецца пры падтрымцы чатырох еўрапейскіх тэлеканалаў, у тым ліку BBC. Мяркуецца, што еўрапейская прэм'ера фільма адбудзецца ў дзень 25-х угодкаў аварыі на ЧАЭС.

Фестываль будзе праходзіць у кінатэатрах Мінска, Магілёва і Бабруйска і працягнецца да 4 чэрвеня. Усе фільмы, якія будуць паказаныя ў Мінску, можна будзе паглядзець бясплатна. У арганізатараў фэсту ў Магілёве і Бабруйску таксама можна будзе замовіць абмежаваную колькасць бясплатных квіткоў. Фінансавая падтрымка фэсту была аказаная Дэлегацыяй Еўрасаюза ў Мінску і 15-ю амбасадамі краін ЕС. Мерапрыемства праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі.

Адначасова з фестывалем у гонар Дня Еўропы будзе таксама праводзіцца фотавыстава пад назвай «Еўропа нашымі вачамі». Больш за 170 беларускіх фатографаў прадставілі на конкурс каля тысячы шасцісот фатаграфій, зробленых у розных еўрапейскіх краінах. Лепшыя фатаграфіі будуць паказаныя ў галерэі кінатэатра «Перамога». Гледачы змогуць аддаць свае галасы за канкрэтныя працы, пераможца, які набярэ большасць галасоў, будзе ўзнагароджаны падчас цырымоніі закрыцця фестывалю 17 мая.

Ініцыятыва арганізацыі такога фестывалю еўрапейскага кіно паўстала падчас чэшскага старшынства ў Еўрасаюзе ў 2009 годзе ў працяг традыцыі, закладзенай у 2005 годзе, калі быў арганізаваны першы кінафэст Еўрасаюза ў Беларусі. Галоўная задача гэтай ініцыятывы — стымуляваць супрацоўніцтва ў галіне культуры паміж Еўрасаюзам і Беларуссю ў якасці асновы для стварэння шырэйшага прасторы ўзаемных адносін.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НАШ ДЭВІЗ НЕПЕРАМОЖНЫ — НІЧОГА НЕ АДДАДЗІМ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Вось і ўсё, капец сяброўству. Нарэшце дайшло, што Расія будзе выбудоўваць з Беларуссю прагматычныя адносіны. А значыць, «як вы да нас, так і мы да вас». Адзінае радуе — пэўна, зараз можна не хваляваца за падвышэнне мытных пошлінаў на замежныя аўтамабілі. Ніякага падвышэння не будзе.**




«У адносінах з Расійскай Федэрацыяй мы зрабілі гіганцкі крок насустрач адзін аднаму. Але апошнім часам расійскае кіраўніцтва захацела выбудаваць з Беларуссю абсалютна прагматычныя адносіны, — заявіў беларускі кіраўнік 4 мая ў штогадовым інтэрв'ю агенцтву «Рэйтэр». — Ну, мы да гэтага гатовыя. Але гэты прагматызм не павінен нішчыць усё тое, што назапашана на сённяшні дзень. А мы зрабілі нямала, і не толькі з цяперашнім кіраўніцтвам Расіі, але і з ранейшым кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі. І гэта задавальняе і беларусаў, і расіян».

«Калі расіяне, у бухгалтэрыі палічыўшы, убачылі, што яны ўжо надта тут ствараюць вялікія выгады для беларускага народа, то я павінен сказаць, што гэта няправільны разлік. Гэта крывабокі, аднабокі прагматызм. Такога прагматызму быць не павінна», — сказаў Лукашэнка.

«Такі разлік аднабокі: увядзенне мытнай пошліны на нафту, нафтапрадукты для аднаго сябра Мытнага саюза, для Беларусі, і неўвядзенне для другога сябра Мытнага саюза, для Казахстана, — гэта як мінімум карупцыйяй папахвае».

Канешне, прагматызм гэты аднабокі і касарукі. Але што ёсць — тое ёсць. І таму трэба адэкватна рэагаваць на выклікі часу. А адэкватнае рэагаванне — гэта пошліны на аўто.

Дзяржаўны мытны камітэт Беларусі ўжо выказаўся на гэты конт. Беларускі бок лічыць неабходным захаваць дзеючыя ў рэспубліцы стаўкі ўвазной пошліны на аўтамабілі для фізічных асоб і пасля ўступлення ў сілу мытнага кодэкса Мытнага саюза (з 1 ліпеня 2010 г.). «Рэспубліка мае намер дастаткова жорстка адстойваць сваю пазіцыю», — падкрэслілі ў ДМК.

Раней паведамлялася, што Расія настойвае на падвышэнні Беларусі і Казахстанам з 1 ліпеня 2010 года ставак увазной пошліны на аўтамабілі для фізічных асоб да расійскага ўзроўню. У выпадку, калі іх велічыня не будзе ўзгодненая краінамі — удзельніцамі Мытнага саюза і не будзе зацверджаная Камісіяй гэтага органа, Беларусь, гэтак жа, як і Расія, і Казахстан, захавае нацыянальныя стаўкі на аўтамабілі для ўвозу фізічнымі асобамі.

Зразумела, Беларусь у гэтым пытанні ўпрэцца рогам. «Альбо вы нам усю нафту без пошлін, альбо — ніякіх пагадненняў па аўто!» — скажа беларуская дэлегацыя, і будзе мець рацыю. Бо калі ўжо прагматызм — дык з абодвух бакоў. Можам яшчэ і пра расійскія вайсковыя базы ўзгадаць…

Што яшчэ цікавага заявіў Аляксандр Рыгоравіч замежнаму агенцтву? Здаецца, нічога новага. Нас па-ранейшаму абкружаюць ворагі з усіх бакоў. Але маленькая, але ганарлівая рэспубліка не здаецца.

«За апошні час мы шмат зрабілі для будавання адносінаў з нашымі заходнімі партнёрамі. Але калі браць у цэлым, я б не сказаў, што мы зрабілі ўсё, на што разлічвалі, і што Захад пайшоў нам насустрач. Ёсць добрыя зрухі, але гэта працэс нездзейсненых надзей. Мы чакалі ад Захаду большага», — сказаў Лукашэнка.

Ён нават назваў заходніх палітыкаў «безадказнымі», заявіўшы, што ў якасці крокаў у адказ для паляпшэння адносінаў з Беларуссю Еўрасаюз павінен аднавіць паўнавартасны палітычны дыялог з Мінскам, адмовіцца ад візавых санкцый і вярнуць краіне гандлёвыя прэферэнцыі, якіх яна пазбавілася некалькі гадоў таму з-за палітычных рознагалассяў з Захадам. «Мы зробім роўна столькі крокаў, колькі гатовы зрабіць Захад. Я не магу нават сказаць пра тыя адчувальныя крокі, якія я зрабіў, і Захад нас кінуў. І гэта нам дорага каштавала», — сказаў Лукашэнка.

Дзіўна чуць такія заявы. Толькі нядаўна Лукашэнка лаяў Расію за адмову ад супрацоўніцтва і дзякаваў Міжнароднаму валютнаму фонду за тое, што ён падтрымаў Беларусь у складаны час. А зараз аказваецца, што ўся гэта падтрымка, усе крэдыты, усе траншы — гэта папросту «кідалава». Але «кідальшчыкі» звычайна забіраюць грошы, а не даюць іх.

«Можа быць, Захаду хацелася б тут больш хутка правесці прыватызацыю. Не толькі Захаду ў дадзеным выпадку, але і Усходу, — мяркуе беларускі кіраўнік. — На што я заўсёды гаварыў: мы не супраць, але ў нас ёсць нацыянальны інтарэс, і нічога бясплатна не аддадзім».

«Каму гэты тэзіс падабаецца? Напэўна, не ўсім, — сказаў Лукашэнка. — Абсалютна мы не супраць, нармальны працэс, але за добрыя грошы, на рынычных умовах, і ніякага шарлатанства і карупцыйнай прыватызацыі ў Беларусі не было і не будзе. Таму, відаць, і гэты фактар раздражняе нашых заходніх партнёраў, і яны нас папракаюць у павольных тэмпах рэфармавання эканомікі і, канкрэтызую, прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці».

Таксама Аляксандр Лукашэнка параіў часоваму ўраду Кыргызстана не абцяжарваць яго просьбамі аб экстрадыцыі скінутага прэзідэнта гэтай краіны Курманбека Бакіева, сказаўшы, што той знаходзіцца пад абаронай беларускай дзяржавы. «Да мяне ніхто афіцыйна не звяртаўся. Але адразу хачу афіцыйна заявіць — гэтыя звароты будуць марныя і незважальныя для часовага ўрада. Прэзідэнт Кыргызстана знаходзіцца пад абаронай беларускай дзяржавы і прэзідэнта», — цытуе «Рэйтэр» Лукашэнку.

«Не трэба гэтак званаму часоваму ўраду звяртацца з патрабаваннем выдаць Бакіева. Каму выдаць? Ці захачу я яшчэ мець зносіны з тымі, хто сёння ва ўладзе ў Кіргізіі», — сказаў Лукашэнка.

Карацей, нічога і ніхто не атрымае. Асабліва, задарма. І няма чаго на чужы каравай разяваць сваю хавалку.

Акрамя выступу Лукашэнкі, на тыдні здарылася яшчэ адна адметная падзея. Іван Міхайлаў, асуджаны за адмову служыць у арміі з-за рэлігійных перакананняў, поўнасцю апраўданы. Такое рашэнне 4 мая вынес суд Мінскага раёна. 21-гадовы прыхаджанін абшчыны «Новы запавет» Іван Міхайлаў адмовіўся ад праходжання тэрміновай вайсковай службы, на якую быў прызваны ў снежні 2008 года. Ён заявіў прызыўной камісіі Мінскага раёна, што служба ў арміі супярэчыць яго рэлігійным пераканаінням, і запытаў альтэрнатыўную службу ў адпаведнасці з артыкулам 57 Канстытуцыі.

За гэта ён адседзеў амаль тры месяцы ў турме. І зараз — апраўданы. Можа, гэты крок стане пачаткам альтэрнатыўнай службы ў Беларусі?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЛЕАНІД КОЗІК



Наватарам тыдня бясспрэчна з'яўляецца старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік. Ён прапанаваў радыкальны метад барацьбы з дэмаграфічнымі праблемамі беларусаў — увесці падатак з мужчын ва ўзросце ад 25 да 40 гадоў, якія не маюць дзяцей. «Калісьці такая практыка ўжо прымянялася. Трэба да гэтага вярнуцца, — лічыць ініцыятар. — Гэта — і папаўненне бюджэту, і своеасаблівы, досыць важкі стымул для тых прадстаўнікоў моцнага полу, якія сыходзяць ад свайго грамадзянскага абавязку. Пры гэтым, калі нараджаецца першае дзіця, падатак мусіць быць паніжаны на 50 працэнтаў. Пры нараджэнні другога — падатак адмяняецца. Нарадзіўся трэці — дзяржава вяртае ўвесь сплачаны раней падатак».

Апроч таго Леанід Козік таксама прапануе стымуляваць сем'і ўжо зараз нараджаць другое дзіця. «Пэўна, для нашай краіны гэта было бы актуальна, паколькі зараз беларускія сем'і абмяжоўваюцца ў асноўным адным малым. У апошні час у нас загаварылі аб матчыным капітале як аб прагрэсіўнай форме сацыяльнай абароны. Вядома, гэта таксама можа стымуляваць нараджальнасць, але гэта няпросты і няхуткі шлях. Капітал выдаць можна, але трэба думаць, як яго захаваць 18 гадоў», — зазначыў кіраўнік Федэрацыі прафсаюзаў.

Падатак на бяздзетнасць існаваў у СССР як «Падатак на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян» з лістапада 1941 года. Бяздзетныя мужчыны ад 20 да 50 гадоў і бяздзетныя замужнія жанчыны ад 20 да 45 гадоў павінны былі адлічваць 6 працэнтаў ад заробку дзяржаве. З канца 1980-х ільготы па падатку атрымалі маладыя на працягу аднаго года з моманту рэгістрацыі шлюбу.

### ГАННА ХІТРЫК



Гурт «ДзеціДзяцей» пад кіраўніцтвам яго салісткі і актрысы Купалаўскага тэатру Ганны Хітрык выпусціў свой першы цалкам беларускамоўны CD пад назвай «Рух», да гэтага калектыў запісаў два рускамоўныя альбомы

«У нашым гурце «ДзеціДзяцей» усе беларусы. Мне падабаецца наша мова. Можа, я не вельмі дабра яе ведаю, але я яе вывучаю. Я не люблю, калі нешта робіцца адмыслова, я не чараўнік, каб сесці і прыдумаць беларускую песню. Беларускі альбом — не таму, што гэта модная, не таму, што гэта трэба, — а таму, што нам так хочацца. Так хочуць усе ў нашым гурце», — цытуе словы Ганны «Радыё Рацыя».

Вялікая частка музыкаў гурта «ДзеціДзяцей» з'яўляюцца акторамі беларускага нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы. Сімвалічна тое, што менавіта беларускамоўны альбом музыкі вырашылі прэзентаваць на роднай для іх сцэне. Песні з першага беларускамоўнага альбому «ДзеціДзяцей» пад назвай «Рух» прагучалі ў жывым канцэрце-прэзентацыі 4 мая на вялікай сцэне Купалаўскага тэатра ў Мінску.

### АЛЕНА ВІНІЦКАЯ




Беларуская 36-гадовая спартсменка Алена Вініцкая перамагла ў Пітсбургскім марафоне. Сёлета ў спаборніцтвах удзельнічалі каля 5 тысяч атлетаў. Наша бягунка пераадолела дыстанцыю за 2 гадзіны 42 хвіліны і 33 секунды. «Ведаеце, я ўжо немаладая жанчына. Выдатна спаборнічаць разам з маладымі дзяўчатамі і апярэджваць іх. Я проста бегла ў сваім тэмпе і пасля 14-й мілі аднаасобна захапіла лідэрства да самога фінішу», — пракаментавала свой поспех Алена.

Марафон быў азмрочаны прыкрым інцыдэнтам. Арганізатары змушаныя былі перапыніць спаборніцтвы з-за выбуховага прыстасавання, якое было знойдзена недалёка ад трасы. Яно знаходзілася ў мікрахвалёвай печы на тратуары. Паліцыя з дапамогай робата абясшкодзіла бомбу, пасля чаго марафон аднавілі, крыху змяніўшы маршрут. Праўда, лідэры спаборніцтваў паспелі фінішаваць яшчэ да моманту выяўлення небяспекі.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА



# ПА ГОДУ ЗА ПАТРОН

◂ Працяг. Пачатак на стар. 1.

Праваабаронцы лічаць, што і Аляксандр Ларын будзе ў небяспецы, бо з'яўляецца сведкай таго, як «шылася» справа, ведае пра падтасоўку фактаў. Аляксандра Ларына затрымалі 31 студзеня 2009 года як падазронага ў датычнасці да выбуху 4 ліпеня 2008 года на праспекце Пераможцаў у Мінску. Сувязі з гэтым злачынствам Ларын не прызнаваў, як і сваёй датычнасці да гранатамёту, які быў знойдзены ў Гродна ў 2005 годзе. Прызнаўчыя паказанні па гэтай справе Аляксандр Ларын пачаў даваць 24 лютага 2009 года. Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка і Юрый Лявонаў (з яго праз паўгода былі знятыя абвінавачванні) былі затрыманыя 8 лютага 2009 года.

Канфлікт з уладамі Мікалая Аўтуховіча пачаўся яшчэ ў 2003 годзе, калі падатковая інспекцыя Ваўкавыска выставіла прадпрымальніку штраф памерам у мільён доляраў. Падставай для гэтага сталіся нібыта парушэнні ў выплаце падаткаў. Гэта рашэнне Аўтуховіч абскарджваў у судах усіх інстанцый цягам двух гадоў, на знак пратэсту супраць несправядлівых рашэнняў абвяшчаў галадоўкі.

У кастрычніку 2005 года Мікалая Аўтуховіча арыштавалі. Па абвінавачванню ў нявыплаце падаткаў у ліпені 2006 года яго асудзілі да трох з паловай гадоў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці і забаронай на прадпрымальніцкую дзейнасць цягам 5 гадоў. У студзені 2008 года пакаранне было заменена на папраўчыя працы па месцы жыхарства.

У лютым 2009 года Аўтуховіч быў зноў арыштаваны па абвінавачванні ў падпале дома. Падчас цяперашняга судовага разгляду Мікалай Аўтуховіч заявіў, што ведае чалавека ў праваахоўных структурах, які можа даказаць, што крымінальную справу супраць яго фірмы ў свой час завялі на замову зверху. Быццам бы тагачасны кіраўнік Дэпартамента фінансавых расследаванняў Дзяржкантролю Анатоль Грамовіч даў загад сваім падначаленым завесці такую справу. «Інакш шукайце сабе іншую працу», — напісаў Грамовіч, па словах Аўтуховіча, у ДФР Гродзенскай вобласці. Летась Анатоль Грамовіч быў асуджаны да зняволення за злоўжыванні супрацоўнікаў Брэсцкай мытні.

Эксперты падлічылі, што паводле першай крымінальнай справы, заведзенай на Мікалая Аўтуховіча яшчэ ў 2003 годзе, яго пазбавілі маёмасці на агульную суму каля пяцісот тысяч долараў. «Канешне, у чалавека была злосць. Але вар'яцтвам было б звяртацца да Ларына, асобы з неадназначнай псіхікай, каб адпомсціць, страляць па дому чыноўніка з пляцоўкі, адкуль гэты дом не бачны.

Сустаршыня аргкамітэта па стварэнні руху ветэранаў баявых дзеянняў у Афганістане «Абаронцы Бацькаўшчыны» Аляксандр Камароўскі лічыць, што абвінавачванні Мікалая Аўтуховіча ў падрыхтоўцы тэракту супраць Васіля Каменкі і Уладзіміра Саўчанкі «маразматычныя», і былыя вайскоўцы так не дзейнічаюць. «Я занадта добра ведаю нашу брацію па ўсяму былому Савецкаму Саюзу. Ніводны з нас не будзе звязвацца з дробным крымінальнікам і не даручыць яму зброю, — заявіў Камароўскі журналістам. — Наогул, так тэракты не робяцца. Проста пад'язджаюць два чалавекі з аўтаматамі Калашнікава і ва ўпор расстрэльваюць таго, каго ім «замовілі». А тут — нейкі цырк прад'яўлялі».

Праваабаронцы, якія прысутнічалі на судовым працэсе, гавораць, што была вялікая колькасць працэсуальных парушэнняў, неправераных фактаў, многія сведкі адмовіліся ад ранейшых паказанняў, расказвалі пра ціск следства на іх. «Грамадству варта задумацца, чаму сядзіць менавіта Аўтуховіч? Яшчэ падчас працэсу ў 2006 годзе ў сваім заключным слове ён сказаў: «Гэты суд — вынік маёй барацьбы з карупцыяй у Гродзенскай вобласці». Цяпер мы бачым працяг, бо Аўтуховіч не супакоіўся, не спыніў сваёй выкрываючай дзейнасці супраць чыноўнікаў», — зазначае старшыня Цэнтра па правах чалавека Раіса Міхайлаўская.

***P.S.*** *Пасля суда былі затрыманыя Аляксандр Казулін, Мікола Дземідзенка, Аляксандр Макаеў. На іх склалі пратаколы за нецэнзурную лаянку (тыповы абсурд). 12 мая адбудзецца суд.*

З НАГОДЫ

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ: СВАБОДА, ПРЭСА І АПОСУМ

Вольга ХВОІН

**Сусветны дзень свабоды прэсы Беларусь сустрэла ў чаканні разгляду Саветам міністраў праекта пастановы аб рэгламентацыі дзейнасці электронных СМІ. А асобныя журналісты — на хвалі вобшукаў і допытаў па крымінальнай справе аб паклёпе на высокапастаўленага супрацоўніка КДБ.**




«Ужо не першы год незалежным журналістам у Беларусі даводзіцца выконваць свае прафесійныя абавязкі ў надзвычай неспрыяльных умовах, — гаворыцца ў заяве, распаўсюджанай Беларускай асацыяцыяй журналістаў з нагоды Сусветнага дня свабоды прэсы. — Улады краіны татальна кантралююць інфармацыйную прастору і абмяжоўваць дзейнасць незалежных СМІ — праз адмовы ў доступе да інфармацыі, праз забароны на распаўсюд і друк, праз судовы пераслед, праз эканамічную дыскрымінацыю. Апошняя трывожная тэндэнцыя — адкрыты ціск на журналістаў з боку сілавых структур і спецслужб». Прычыны гэтага бачацца ў набліжэнні палітычнай кампаніі па выбарах прэзідэнта.

Па словах міністра інфармацыі Алега Праляскоўскага, бліжэйшым часам у Савет міністраў будзе ўнесены праект пастановы аб рэгламентацыі дзейнасці электронных СМІ. «СМІ трэба рэгістравацца ў адпаведнасці з заканадаўствам, — заявіў Праляскоўскі. — У законе аб СМІ ёсць адсылачная норма пра тое, што рэгламентацыя дзейнасці электронных СМІ будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з пастановай аб СМІ. І там будзе вялікая ступень рэгламентацыі дзейнасці менавіта інтэрнэт-СМІ».

Калі гэта пастанова будзе прынятая, то магчыма яшчэ большае абвастрэнне супрацьстаяння недзяржаўнага медыйнага поля і ўладных структур. Цяпер у беларускай прасторы дзейнічае многа інтэрнэт-рэсурсаў, якія карыстаюцца папулярнасцю і маюць напрацаваны аўтарытэт, але дзейнасць іх не рэгулюецца Законам аб сродках масавай інфармацыі.

Пра магчымыя праблемы можна паразважаць, зыходзячы са слоў самога міністра. «Памятаеце, ёсць такая арганізацыя БАЖ, яе прадстаўнікі размахвалі корачкай «Прэса», а з'яўляліся ўсяго толькі сябрамі грамадскай арганізацыі, то бок яны прэсай не з'яўляюцца. Нават судовая практыка існуе, і арганізацыі было адмоўлена ў вызначэнні «прэса», — заявіў Праляскоўскі ў online-канферэнцыі на сайце БЕЛТА, адказваючы на пытанне наконт магчымай акрэдытацыі пры розных ведамствах прадстаўнікоў інтэрнэт-рэсурсаў і блогераў. — Перш чым акрэдытавацца, трэба зарэгістравацца як сродак масавай інфармацыі, толькі тады можна казаць: «Мы прадстаўнікі прэсы, акрэдытуйце». Таму мой пункт гледжання: СМІ трэба рэгістравацца ў адпаведнасці з заканадаўствам. У законе аб СМІ ёсць адсылачная норма пра тое, што рэгламентацыя дзейнасці электронных СМІ будзе весціся ў адпаведнасці з пастановай аб СМІ».

На пачатку мая, у перыяд, калі адзначаюцца Дзень свабоды прэсы, Дні радыё і друку, у краіне праходзіць выстава «СМІ ў Беларусі». Мерапрыемства гэта, нягледзячы на існыя праблемы ў медыя-сферы, мае фармат забаўляльнага шоу — танцы, спевы, карнавал, сабакі і апосум. Пытанні вострыя і насамрэч важныя для журналістаў (напрыклад, акрэдытацыя замежных СМІ, доступ да інфармацыі, распаўсюд выданняў) арганізатары выставы і спадарожных мерапрыемстваў традыцыйна абыходзяць. Сёлета ў шэраг дзяржаўных рэспубліканскі выданняў, тэлеканалаў, раёнак, СМІ Кітая і Індыі прашчамілася і Асацыяцыя выдаўцоў рэгіянальнай прэсы «Аб'яднаныя масмедыя». Таму на адным стэндзе наведнікі маглі пазнаёміцца з больш чым дваццацю незалежнымі выданнямі Беларусі — «Intex-press», «Газетай Слонімскай», «Інфа-кур'ерам», «Брестской газетой», «Вольным Глыбокім», «Рэгіянальнай газетай» ды іншымі.

**Беларуская асацыяцыя журналістаў сышла з барыкад на фронце адстойвання свабоды слова і правяла пазітыўную акцыю з сэнсам**

Беларуская асацыяцыя журналістаў сышла з барыкад на фронце адстойвання свабоды слова і правяла пазітыўную акцыю з сэнсам: наведвальнікі і ўдзельнікі выставы атрымалі віншавальныя паштоўкі з надпісам «Разам з сумленнем і адказнасцю» з нагоды Сусветнага дня свабоды прэсы. Гэтым БАЖ хацеў паказаць, што журналісты дзяржаўных і недзяржаўных СМІ мусяць найперш бачыць адзін у адным калег, а не ворагаў і ідэалагічных работнікаў. А свабоднае слова немагчымае без сумлення і адказнасці яго аўтараў. Паштоўкі атрымалі міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі, першая намесніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч, кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі, міністр культуры Павел Латушка.

У час размовы з журналістам «Новага часу» Павел Латушка выказаў шчырае здзіўленне, калі даведаўся, што гэта выданне пазбаўлена магчымасці даходзіць да чытачоў праз дзяржаўную сістэму распаўсюду. Міністру культуры паводле прафесійных абавязкаў, магчыма, гэтай інфармацыяй і не абавязкова валодаць, але момант таго, што чыноўнік прыходзіць на выставу СМІ і з прыватнай размовы даведваецца такія факты, шмат пра што гаворыць. Зрэшты, дзяржаўная сістэма складаецца і напаўняецца непасрэдна людзьмі, таму і адказнасць за тое, што адбываецца, нясуць усе.

Павел Паўлавіч пагадзіўся адказаць на адно пытанне для газеты. Пытанне «Новага часу» гучала так: ці задаволены міністр культуры тым, што ў Беларусі ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду толькі дзве рэспубліканская грамадска-палітычныя газеты, якія выходзяць цалкам на беларускай мове? На што Латушка, вядомы сваёй прыязнай пазіцыяй да мовы, расказаў пра значнасць выхаваўчага працэсу. «Важнай справай з'яўляецца асвятленне падзей у галіне культуры на беларускай мове, але не варта рабіць гвалту, каб насамрэч гэта было запатрабавана. Важны выхаваўчы працэс, які пачынаецца ці не з дзіцячага садка, трэба ствараць прыхільнае стаўленне да беларускай мовы і культуры. Калі мы будзем ісці гэтым шляхам, то і беларускамоўных газет будзе больш, і чытаць іх будуць гэтак жа, як цяпер чытаюць па-руску», — сказаў міністр. А пасля з усмешкай дадаў: «Дыпламат, так?»

Апошняя фраза міністра — гэта сімптом усяго нашага грамадства. Яна — альтэрнатыўны сінонім традыцыйнаму апраўданню сваіх дзеянняў чыноўнікаў і супрацоўнікаў міліцыі, якія гавораць: «Я ўсё разумею, але, вы ж ведаеце, мушу зрабіць менавіта так».

МЕРКАВАННЕ

# СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ. ТАК? НЕ?

**У размове з Валерыем Філіпавым, адным з першых праваабаронцаў, хто звярнуў увагу на праблему смяротнага пакарання ў нашай краіне, Ірына Тоўсцік імкнулася не проста атрымаць аргументы на карысць адмены смяротнай кары, але знайсці адказы для вырашэння складанай дылемы, што існуе ў грамадскай свядомасці, — «так» ці «не» гэтай вышэйшай меры пакарання.**



**Даведка:**

Валеры Філіпаў, доктар фізіка-матэматычных навук, праваабаронца. Сябра праўлення РГА «Прававая ініцыятыва», адзін з заснавальнікаў і сябра Рады Беларускага Хельсінскага Камітэта. Пад рэдакцыяй В. Філіпава выданы тры кнігі, прысвечаныя праву на жыццё: «Смяротнае пакаранне. Так? Не?» (2001 г.), «Адмена смяротнага пакарання ў Рэспубліцы Беларусь», «Права на жыццё і забарона катаванняў: еўрапейскія стандарты і заканадаўства Рэспублікі Беларусь» (2008 г. — трэцяе выданне).

***— Валеры Віктаравіч, што падштурхнула вас звярнуць увагу на гэту праблему?***

— Абсалютная адсутнасць логікі. У Канстытуцыі нашай краіны запісана, што дзяржава гарантуе права на жыццё. Неад'емнае права кожнага чалавека, якое немагчыма абмежаваць. Альбо яно ёсць, альбо яго няма. Аднак дзяржава дазваляе сабе адымаць гэта права ў чалавека. Рэальная практыка прыходзіць у абуральную супярэчнасць з Канстытуцыяй.

***— Наколькі гэта мера як пакаранне адпавядае мэтам крымінальнай адказнасці?***

— Як від пакарання смяротная кара не можа разглядацца, таму што супярэчыць прынцыпам крымінальнай адказнасці, у якіх закладзена выпраўленне злачынцы, а не яго знішчэнне. У крымінальным заканадаўстве і Рэспублікі Беларусь, і іншых краін фігуруе менавіта выпраўленне злачынцы, іншага не паказана. Таму пазбаўленне чалавека жыцця супярэчыць мэтам і прынцыпам крымінальнай адказнасці. Такім чынам, з пункту гледжання фармальнай логікі ў Беларусі трэба альбо мяняць Крымінальны кодэкс, альбо адмяняць смяротнае пакаранне.

***— Але многія асцерагаюцца, што адмена смяротнага пакарання прывядзе да росту злачынстваў...***

— На гэтую тэму было праведзена шмат даследаванняў. Іх вынікі паказваюць, што ўзровень злачыннасці не залежыць ад наяўнасці або адсутнасці смяротнага пакарання ў краіне. Непазбежнасць пакарання — найбольш сур'ёзны стрымліваючы матыў. Узровень злачыннасці, на самай справе, вызначаецца не толькі сістэмай мер крымінальнага пакарання, а шэрагам іншых фактараў — стабільнасцю эканамічнага становішча, узроўнем карупцыі ў краіне, узроўнем культуры... Сур'ёзная праблема — узровень алкагалізацыя насельніцтва. Большасць забойстваў і наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў здзейсняюцца асобамі, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення.

***— У выпадку замены смяротнага пакарання на пажыццёвае зняволенне, кажуць, што падаткаплацельшчыкі будуць «вымушаны карміць злачынцу са сваёй кішэні»?***

— Яны і зараз кормяць масу зняволеных. А калі хтосьці здзейсніў забойства, тады ўзнікае пытанне, чаму я павінен карміць забойцу. Але ж забойцамі не нараджаюцца, імі становяцца. І як бы трывіяльна гэта ні гучала, такімі іх робіць грамадства.

Давайце возьмем канкрэтны прыклад — тую ж гомельскую злачынную групоўку. На працягу 10 гадоў яны здзяйснялі злачынствы, забойствы... І што, улада не магла з імі справіцца, праваахоўныя органы не маглі іх знайсці на працягу дзесяці гадоў?

У выніку трох з гэтай злачыннай групоўкі прысудзілі да смяротнага пакарання. Ціха і хутка пазбавіліся, каб лішняе не ўсплыло. Магчыма, калі б яны засталіся жывыя, высветліліся б новыя факты і імёны людзей, якія маюць дачыненне да гэтых злачынстваў. Але для гэтага праваахоўным органам трэба было зрабіць вялікую працу. А так — людзей пакаралі смерцю, і канцы ў ваду.

Ці, да прыкладу, справа Ігнатовіча. Усплыў факт яго датычнасці да знікнення Дзмітрыя Завадскага. Але Ігнатовіча асудзілі да смяротнага пакарання, не паглыбляючыся ў гэта пытанне. І толькі шмат у чым дзякуючы ўмяшанню генеральнага сакратара Савета Еўропы, прадстаўнікоў іншых міжнародных арганізацый, смяротнае пакаранне Ігнатовічу замянілі на пажыццёвае зняволенне. Такім чынам, застаўся носьбіт вельмі каштоўнай інфармацыі, звязанай з нераскрытай справай. Атрымліваецца, што пажыццёвае зняволенне дае магчымасць пры неабходнасці вярнуцца да расследавання такога кшталту спраў.

Яшчэ адзін важны аспект: пытанне аб адмене смяротнага пакарання непасрэдна звязана з глабальнай праблемай рэфармавання пенітэнцыярнай сістэмы ў цэлым. Абцяжараныя першапачаткова гулагаўскай сістэмай, а затым сістэмай калоній, якія ствараліся пры будоўлях буйных заводаў для прадастаўлення некваліфікаваных працоўнай сілы, мы жудасна зацягнулі з гэтым працэсам. Усе разумеюць, што «турма не выпраўляе». Пенітэнцыярныя ўстановы толькі памнажаюць колькасць людзей з разбуранымі сацыяльнымі, сямейнымі адносінамі, падарваным здароўем, страчанай кваліфікацыяй. І пераадоленне гэтых наступстваў ажыццяўляецца, у тым ліку, і за наш кошт, з кішэні падаткаплацельшчыкаў.

Калі разабрацца, то значная частка асуджаных не ёсць злачынцы па свайму менталітэту, схільнасці ці ладу жыцця. Большасць з іх нясуць пакаранне за злачынствы маёмаснага характару. Дык навошта людзей, якія не з'яўляюцца сацыяльна небяспечнымі, пазбаўляць свабоды на многія гады і трымаць у калоніі за наш кошт? Хай працуюць і кампенсуюць матэрыяльную шкоду.

А вось людзі, схільныя да сацыяльна небяспечных дзеянняў, якія здзяйсняюць цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы, ідуць на забойствы, — гэта і ёсць тая катэгорыя людзей, якая павінна ўтрымлівацца ў ізаляцыі. Зараз робяцца спробы гэту сітуацыю неяк развязаць.

***— Калі паўстае пытанне аб адмене смяротнага пакарання, дзяржава спасылаецца на волю народа, выказаную на рэферэндуме 1996 года.***

— Праводзіць рэферэндум па гэтым пытанні, калі людзі зусім не гатовыя да яго, было заўчасным крокам. Людзі ў гэтым пытанні не інфармаваныя. Людзям трэба было даць нагоду абмеркаваць гэтую праблему, паразважаць. З кожным годам працэнт насельніцтва, які выступае за смяротнае пакаранне, скарачаецца. Які ён на самай справе, цяжка сказаць, але гэта не той 81 %, які быў агучаны на рэферэндуме 1996 года. Падкрэслю, што ў іншых краінах смяротнае пакаранне адмянялася ў сітуацыі, калі большасць насельніцтва выступала за яго захаванне.

Класічны прыклад — Германія, дзе гэты від пакарання адмянілі ў 1949 годзе. І калі на наступны год пасля адмены смяротнага пакарання 55 % насельніцтва было за яго, то ў 1973 годзе «за» заставалася толькі 30 %, а ў 1976-м — 22 %.

Трэба дакладна разумець, што адмена смяротнага пакарання — гэта палітычнае рашэнне. І ў нашай дзяржаве толькі вышэйшае кіраўніцтва можа прыняць такое рашэнне.

***— У большасці краін, дзе яшчэ існуе гэты від пакарання, уся інфармацыя публічная, у тым ліку і самі судовыя працэсы па такіх справах. У Беларусі ж усё адбываецца за зачыненымі дзвярыма.***

— Што тычыцца статыстыкі ў дачыненні да вынесеных смяротных прысудаў, то яна цяпер усё ж даступная. У сакрэце трымаюцца звесткі аб колькасці прыведзеных у выкананне прысудаў. Самы красамоўны прыклад — два рашэнні Камітэта па правах чалавека ААН, у якіх скаргі двух заяўнікаў (ад імя маці, сваякоў у Камітэт звярталіся праваабаронцы) прызнаныя абгрунтаванымі. Сапраўды, сваякі асуджаных да пакарання падвяргаюцца негуманнаму, бесчалавечнаму абыходжанню. Яны знаходзяцца ў поўным няведанні, дата прывядзення прысуду ў выкананне не паведамляецца і, прыносячы перадачы, маці не ведалі, што іх сыны ўжо расстраляныя. Атрымліваецца, што дзяржава як бы ўскладае долю адказнасці за здзяйсненне злачынства на сваякоў злачынцаў. І гэта — чарговы абсурд. Чаму гэтыя людзі павінны несці павялічаныя такімі адносінамі пакуты?

***— У нашы дні сусветная тэндэнцыя — адмена смяротнага пакарання. З 192 краін-удзельніц ААН 146 адмовіліся ад гэтага віду пакарання. Як выглядае Беларусь на гэтым фоне?***

— У першую чаргу трэба адзначыць той факт, што Беларусь застаецца адзінай дзяржавай у Еўропе, дзе смяротнае пакаранне захоўваецца дэ-факта і дэ-юрэ. З 56 дзяржаў АБСЕ ўсяго толькі ў дзвюх ужываецца смяротнае пакаранне, і ў пэўнай ступені гэта дзве дзяржавы-антыподы — Беларусь і ЗША. Калі разглядаць праблему ў кантэксце ААН, то сітуацыя пагаршаецца за кошт азіяцкіх, часткова афрыканскіх краінаў.

***— Дарэчы, многія беларусы спасылаюцца на наяўнасць смяротнага пакарання ў ЗША.***

— У гэтым параўнанні не ўсё так проста, як здаецца на першы погляд. Я паспрабаваў супаставіць статыстыку. У 1998 годзе ў нас было прысуджана да смяротнага пакарання 47 чалавек. У ЗША ў тым жа годзе — 306 чалавек. Насельніцтва нашай краіны — каля 10 мільёнаў чалавек, амерыканцаў на той момант было каля 266 мільёнаў, гэта значыць у 26,6 разы больш. Прыкладна трэць штатаў не прымяняюць смяротнае пакаранне. У выніку падлікаў атрымліваецца наступнае: каб ЗША дагналі Беларусь па колькасці смяротных прысудаў на мільён насельніцтва, да смяротнага пакарання там павінна было быць прысуджаны дзесяці 920–930 чалавек.

Зараз, вядома, сітуацыя змянілася. У Беларусі гадоў пяць таму сярод тых, хто адбываў пажыццёвае зняволенне, 30 % складалі асобы, якія здзейснілі забойства ўпершыню. Яны — не мацёрыя, не закаранелыя злачынцы ці маньякі. У большасці сваёй гэта асобы, якія ад ужытку алкаголю страцілі кантролю над сабой.

Я за беражлівае, сакрментальнае стаўленне да чалавечага жыцця і супраць ілюзіі, што, забіваючы рукамі дзяржавы, мы змагаемся са злачыннасцю. У гэтым дачыненні пажыццёвае зняволенне значна больш суровае пакаранне. Гэта адпавядала б і нашым унутраным законам, Крымінальнаму кодэксу, які ставіць мэтай выпраўленне, і прынцыпам хрысціянства.

***— А што магла б даць Беларусі адмена смяротнага пакарання?***

— Адкрываецца шлях у Савет Еўропы. З уступленнем Рэспублікі Беларусь у шэраг еўрапейскіх канвенцый, звязаных з крымінальным правасуддзем, выдачай злачынцаў, да дзяржавы будзе зусім іншае стаўленне. Бо на дадзены момант арыштавана за мяжой злачынцу, які здзейсніў цяжкія злачынствы на тэрыторыі Беларусі, нашай рэспублікі не выдадуць, таму што тут прымяняюцца і катаванні, і смяротнае пакаранне.

Адмена смяротнага пакарання — неабходнейшы крок для Беларусі. Мы хочам прытрымлівацца еўрапейскай традыцыі, калі кажам, што з'яўляемся еўрапейскай дзяржавай. Еўропа яшчэ ў мінулым стагоддзі хацела стаць тэрыторыяй, свабоднай ад смяротнага пакарання. Беларусь не дазволіла Еўропе ажыццявіць гэтыя яскравыя прагі.

Можа, для кагосьці гэта і падстава для гонару...



ВЫБАРЫ

# СМЕРЦЬ «АДЗІНАГА»

Вольга ХВОІН

**За паўгода да прэзідэнцкіх выбараў пра свой намер балатавацца заявілі ўжо чатыры кандыдаты ад апазіцыі, а таксама дзеючы кіраўнік Беларусі. Верагодна, што ў выбарчых бюлетэнях будзе з каго выбраць.**



Пра свае прэзідэнцкія амбіцыі заявілі палітык Алесь Міхалевіч, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі БХД Віталь Рымашэўскі, каардынатар «Хартыі–97» Андрэй Саннікаў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч, лідэр руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч. Чакаецца, што свайго кандыдата вылучаць партыя БНФ, і АГП (выбар паміж Анатолем Лябедзькам і яго намеснікам Яраславам Раманчуком).

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што збіраецца ў чарговы раз балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах, у адваротным выпадку «народ яго не зразумее». Апанент Лукашэнкі з мінулай выбарчай кампаніі Аляксандр Мілінкевіч спробу нумар два заняць прэзідэнцкую пасаду абвясціў пад ідэямі еўрапейскага шляху Беларусі, ліберальнай эканомікі і магчымага негвалтоўнага вулічнага супраціву. «Стратэгія перамогі на прэзідэнцкіх выбарах простая і ясная: трэба прымусіць уладу лічыць галасы выбарцаў разам з намі. Калі гэтага не адбудзецца, значыць, улада галасы не лічыць. І будзем заклікаць людзей да мірнага пратэсту на вуліцах. Калі няма дэмакратыі на выбарчых участках, то дэмакратыя будзе на вуліцах», — заявіў Аляксандр Мілінкевіч падчас прэзентацыі сваёй перадвыбарнай праграмы.

Паводле яго меркавання, лепшай стратэгіі, чым «альбо дэмакратызацыя, альбо вуліца», не існуе. «Наш прэзідэнт гаворыць, што ў яго гістарычная адукацыя. Тады давайце ўспомнім, што было ў Румыніі Чаўшэску, калі ўлада не ішла на дыялог з апазіцыяй. Румынія яшчэ вельмі доўга і пакутліва аднаўлялася ад рэвалюцыі. І ўспомнім, як было ў Чэхіі і Польшчы, калі ўлада ўсё ж пайшла на дыялог з уладай. Там усё прайшло бяскроўна. І ўлада павінна лічыцца з намі — нават афіцыйна яны напісалі мне і Казуліну на выбарах 2006 года каля 10 працэнтаў галасоў», — адзначыў Мілінкевіч.

Палітык пасля мінулых выбараў насамрэч застаўся ў палітычным полі і з'яўляецца адной з найбольш пазнавальных персонаў апазіцыйнага асяродку.

Балючае для гэтых выбараў пытанне: ці будзе адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў, і калі так, то хто? Мілінкевіч выказаўся за вылучэнне «адзінага» (у 2006-м ён ужо меў такі статус), але супраць «балбатні і пустых размоў». «Адзіным кандыдатам павінен быць той, хто мае магчымасць аб'яднаць вакол сябе рэсурсы, фінансавыя і чалавечыя, хто мае волю да перамогі, стратэгію перамогі і мае намер змагацца за перамогу да канца», — падкрэсліў Мілінкевіч. Палітык выказаў сваю гатоўнасць саступіць кандыдату, які прапануе «больш рэальную стратэгію перамогі на выбарах», аднак такіх персон ён пакуль не бачыць.

З заяўленых кандыдатаў ідэю адзінага падтрымаў Віталь Рымашэўскі. Але з ўмовай, што такі палітык будзе яднаць дэмакратычныя сілы на супольных каштоўнасцях і да канца змагацца за перамогу. «Мы не падтрымаем кандыдатаў, якія будуць несці ідэі, звязаныя з пагрозай незалежнасці Беларусі ці легітымізацыяй дзеючага рэжыму», — зазначыў палітык.

Андрэй Саннікаў сказаў, што не лічыць цяпер магчымым вылучэнне адзінага кандыдата, а апанент Лукашэнкі мусіць быць моцным і валявым палітыкам. «Калі будзе некалькі кандыдатаў ад дэмакратычных сілаў, то нічога кепскага ў гэтым я не бачу, але цяпер з заяўленых прэтэндэнтаў я не вылучаю асобы, на карысць якой мог бы зняць сваю кандыдатуру», — зазначыў палітык.

Алесь Міхалевіч прытрымліваецца падобнага меркавання. Да таго ж, ён зазначыў, што «калі вылучэннем адзінага будуць займацца непасрэдна самі кандыдаты, то гэта моцна нагадвае варыянт 2001 года, і непрымальна. Гэта павінны рабіць палітычныя партыі, але дамовіцца яны не могуць, значыць, і адзінага пакуль не будзе», — рэзюмуе Міхалевіч.

Спрэчкі вакол, магчымага, адзінага кандыдата паступова абвастраюцца. Апаненты пацяху пераходзяць да ўзаемных папрокаў і вышукванне адзін у аднаго слабых, на іх погляд, бакоў. Так, чатыры структуры з Беларускага незалежніцкага блоку — «Малады Фронт», БХД, «Правы альянс», рух салідарнасці «Разам» — распаўсюдзілі прапанову, паводле якой выбар адзінага кандыдата ад дэмсілаў мусіць грунтавацца на гатоўнасці кандыдата ў прэзідэнты вывесці людзей на вуліцу, незалежна ад таго, якім будзе падлік галасоў (тут відавочны камень у бок Аляксандра Мілінкевіча), а таксама здольнасці сабраць найбольшую ініцыятыўную групу. Намеснік Мілінкевіча Юрась Губарэвіч заявіў журналістам, што гэтыя прапановы кіраўніцтва руху прыняло да ўвагі, але лічыць іх недастатковымі ў працэдуры вылучэння адзінага кандыдата. «Патэнцыйны адзіны кандыдат мусіць мець здольнасць аб'яднаць вакол сябе людзей, рэсурсы, быць пазнавальным, валодаць пазітыўным іміджам. Апроч Мілінкевіча з заяўленых кандыдатур годных асобаў мы не бачым», — падкрэсліў намеснік лідэра Руху «За свабоду».

Апроч таго, шэраг моладзевых арганізацый заявілі, што калі дэмакратычныя сілы не вызначацца з адзіным кандыдатам, то яны не падтрымаюць нікога з прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду. Моладзевыя арганізацыі гатовыя падтрымаць таго кандыдата, які «зробіць усе магчымыя захады для аб'яднання з іншымі апазіцыйнымі сіламі; заявіць пра незаконнасць удзелу Лукашэнкі ў прэзідэнцкіх выбарах і нелегітымнасць улады; будзе заклікаць людзей да вулічнага пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў і ўзначаліць яго», — цытуе пазіцыю моладзевага палітычнага крыла БелаПАН.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ ПОЙДЗЕ Ў ПРЭЗІДЭНТЫ

Генадзь КЕСНЕР

**У мінскай гасцініцы «Еўропа» 3 мая кіраўнік Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч афіцыйна заявіў, што будзе ўдзельнічаць у наступнай кампаніі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта будзе ўжо другая спроба Мілінкевіча стаць кіраўніком дзяржавы.**



Аляксандр Мілінкевіч распавёў прысутным пра асноўныя накірункі сваёй кандыдацкай праграмы. У якасці механізмаў стварэння «адказнай улады» ў праграме прадугледжана вяртанне да справядлівых, празрыстых выбараў і сапраўднага мясцовага самакіравання. Таксама абвяшчаецца неабходнасць забеспячэння свабоды сродкаў масавай інфармацыі.

Сярод эканамічных крокаў у праграме фігуруюць прыцягненне інвестыцый, якія, па словах Мілінкевіча, «мусяць ісці не ўладзе, але народу», празрыстая бюджэтная палітыка, падтрымка прыватнага бізнесу, выкарыстанне транзітнага патэнцыялу, энергазберагальная палітыка, эфектыўная сельская гаспадарка.

У раздзеле «Сацыяльная палітыка» прадугледжваецца пашырэнне магчымасцей еўрапейскай адукацыі для беларускае моладзі, рэформа жыллёва-камунальнай гаспадаркі і медыцыны, пенсійнага забеспячэння. Што да знешняй палітыкі, то яна будзе накіравана на інтэграцыю Беларусі ў Еўрапейскі саюз, на ўсталяванне празрыстых, добрасуседскіх адносін з Расіяй і курс на пабудову нейтральнай дзяржавы, што замацавана ў Канстытуцыі Рэспубліکі Беларусь.

Дарэчы, Аляксандр Мілінкевіч у выпадку свайго абрання кіраўніком дзяржавы паабяцаў вярнуцца да Канстытуцыі ўзору 1994 года.

Па словах патэнцыйнага прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду, падчас выбараў ён збіраецца абапірацца на Беларускі незалежніцкі блок (БНБ), у які, апроч Руху «За свабоду», уваходзяць зарэгістраваны ў Чэхіі «Малады фронт», незарэгістраваная Партыя «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», Партыя БНФ, некаторыя іншыя дэмакратычныя арганізацыі.

Аднак ужо цяпер, як адзначаюць незалежныя эксперты, тут усё не так проста: як вядома, БХД і БНФ маюць намер выстаўляць на прэзідэнцкія выбары сваіх кандыдатаў, таму разлік Аляксандра Мілінкевіча на падтрымку гэтых апазіцыйных арганізацый можа апынуцца неапраўданым. Тым больш, адказваючы на пытанне, кіраўнік Руху «За свабоду» адзначыў, што ў БНБ сёння вядуцца сур'ёзныя дыскусіі.

«Партыя БХД апошнім часам усё больш кажа, што нам не трэба ісці ў Еўропу, што там не ўсё добра з маральнымі каштоўнасцямі, не вельмі добры стан хрысціянскай веры, і яны кажуць, што нам трэба быць нейтральнай краінай. Я не веру ў тое, што тут магчыма пабудаваць нейтральную краіну па прыкладу Нарвегіі ці Швейцарыі, нам давядзецца рабіць геапалітычны выбар», — падкрэсліў Аляксандр Мілінкевіч.

Літаральна ў той жа дзень на такія словы старшыні Руху «За свабоду» прагучала рэзкая рэакцыя кіраўніцтва БХД у асобе сустаршыні арганізацыі Паўла Севярынца.

«Гэта вельмі дзіўная заява. Мы з'яўляемся еўрапейцамі. Мы рухаемся да адзінай Еўропы, каб разам з суседзямі рабіць яе больш хрысціянскай, каб разам з суседзямі падтрымліваць каштоўнасці хрысціянскай дэмакратыі — той шырокай народнай платформы, якая аб'яднала народы Еўропы і забяспечыла гарантыю захавання правоў кожнага чалавека ў Еўрапейскім саюзе, — адзначыў Павел Севярынец. — Большасць сябраў БХД, паводле ўсіх партыйных апытанняў, — за ўступленне ў Еўрапейскі саюз. Гэта адлюстравана і ў праграме БХД (пункт 12.6). БХД падала заяўку на ўступ у Еўрапейскую народную партыю, і домыслы на гэтую тэму, напэўна, з'яўляюцца пасланнем еўрапейскім партнёрам: маўляў, Мілінкевіч тут адзіны «сапраўдны еўрапеец». Магчыма, Аляксандр Мілінкевіч баіцца канкурэнцыі хрысціянскіх дэмакратаў пры вызначэнні адзінага кандыдата ад Беларускага незалежніцкага блоку? Спадар Аляксандр, не там шукае ворагаў. Шуканне ворагаў сярод сваіх, паклёпы і хлусня — метады палітычнай барацьбы савецкай эпохі. Час гэтых метадаў прайшоў, яны не прымальны для сучасных дэмакратычных лідэраў, як сталага веку, так і маладых», — падкрэсліў сустаршыня БХД.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 10 МАЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**07.20** Мультыплікацыйны фільм «Дзюймовачка» (СССР).
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** У свеце матораў.
**10.00** Кінааповесць «Беларускі вакзал» (СССР).
**12.10** Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія-Украіна). Фільм «Курская дуга».
**13.00** Ваенная драма «На безымянной вышыні» (Расія-Беларусь). 1-я і 2-я серыі.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Ваенная драма «На безназоўнай вышыні» (Расія-Беларусь). 3-я і 4-я, заключная, серыі.
**17.25** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**18.05** «Культурныя людзі».
**18.35** «Арэна».
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Канцэрт В.Лявонцьева.
**21.00** Панарама.
**21.40** Меладрама «Зайздрасць багоў» (Расія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.10** «Здароўе».
**10.55** Пакуль усе дома.
**11.50** «Шчасце ёсць!».
**12.40** «Фазэнда».
**13.20** Фільм «У шэсць гадзін вечара пасля вайны».
**15.00** Прэм'ера. Песні нашай Перамогі.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Дыверсант». Шматсерыйны фільм.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Здабытак Рэспублікі».
**00.05** АНТ прадстаўляе: «Каралеўскія вакацыі». Дакументальны фільм.

**06.50** Фільм «Салдаты».СССР, 1956 г.
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Званая вячэра».
**11.00** «Вялікі горад».
**11.40** «Зорны рынг».
**12.50** Фільм «Паляванне на Вервольфа». Расія - Украіна, 2009 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Дабро пажаліцца».
**17.00** «Наша справа».
**17.10** «Званая вячэра».
**18.05** Фільм «Пра тых, каго памятаю і люблю».СССР, 1973 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Мы з будучыні». Расія, 2008 г.
**22.40** «Сталічны футбол».
**23.10** Неюбілейны вечар. Сяргей Бязрукаў.

**06.50** Ваенна-прыгодніцкая кінааповесць «Дзяўчынка шукае бацьку» («Беларусьфільм»).
**08.15** Маналогі аб вайне.
**08.25** «Зорка». Гала-канцэрт.
**09.45** У гэты дзень.
**09.50** Дакументальны фільм «Лінія жыцця. Лекары вайны» (Беларусь).
**10.20** Ваенная драма «Рабінавы вальс» (Расія).
**12.10** Дакументальны фільм «Выпускны на мінным полі» (Расія).
**12.40** Маналогі аб вайне.
**12.50** «Пра мастацтва».
**13.15** Экспедыцыя. Абранае.
**13.20** «Памяць. Векапомныя дні былых франтавікоў».
**13.50** Пазакласная гадзіна.
**14.05** Бухта капітанаў.
**14.45** Кінараман «Лёс» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**17.45** «Мы-беларусы». Канцэрт.
**18.50** Маналогі аб вайне.
**19.00** Ваенная драма «Тарпеданосцы» (СССР).
**20.50** Калыханка.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Германія-Фінляндыя. Прамая трансляцыя.
**23.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.25** Жывы гук.

**07.00** Ваенна-патрыятычны фільм «Смяротная сутычка». Расія, 2010 г.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**12.30** Фільм «Ішоў чацвёрты год вайны».
**14.00** Весткі.
**14.10** Прэм'ера. «Расія супраць Гітлера. Непакорная мяжа». Гарады воінскай славы. Туапсэ.
**14.40** Меладрама «Дзённы цягнік».
**16.25** Фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».
**18.05** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма. Працяг.
**21.10** Фільм «Карасі». Расія, 2008 г.
**23.15** «Нічога асабістага».
**23.30** Авантурная камедыя «Руская гульня». Расія, 2007 г.

**05.50** Баявік «Прыступіць да ліквідацыі».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Першая кроў».
**11.15** «Забыты парад». Дак. фільм.
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** Ваенная драма «Чаклун і Румба».
**14.55** Дэтэктыў «Рэквіем для сведкі».
**16.00** Сёння.
**16.20** Дэтэктыў «Рэквіем для сведкі».
**19.00** Сёння.
**19.30** Фільм «Адстаўнік».
**21.15** Фільм «Адстаўнік-2».
**23.05** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».

**09.30** Матаспорт па выхадных.
**09.45** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Італіі (Монца). Заезд 1-ы.
**10.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Італіі (Монца). Заезд 2-і.
**11.00** Веласпорт. «Тур Італіі». Амстэрдам-Утрэхт (Нідэрланды). 2-і этап.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Італіі (Рым). Фінал.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**15.00** Веласпорт. «Тур Італіі». Амстэрдам. Мідлбург (Нідэрланды). 3-і этап. Прамая трансляцыя.
**18.15** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**20.30** Футбол. Еўрагалы (Італія).
**20.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.30** Футбол. Еўрагалы (Германія).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**00.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**01.00** Веласпорт. «Тур Італіі». Амстэрдам. Мідлбург (Нідэрланды). 3-і этап.

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** Госць «Белсату».
**17.50** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.50** Невядомая Беларусь: «Свіцязь, горад на дне возера», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Семя», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**22.05** Фільматэка майстроў: «Жэлары», маст. фільм, 2003 г., Чэхія–Славакія–Аўстрыя.
**00.30** Аб'ектыў.

## 11 МАЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.05, 19.30, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Вострасюжэтная ваенная драма «Радзіма або смерць» (Беларусь-Расія).
**10.35** Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія-Украіна). Фільм «Аперацыя «Баграціён».
**11.25** Відэафільм АТН «Тэатральны раман».
**12.10** Камедыйная меладрама «Скарб» (Расія).
**14.05** Nota Bene.
**14.30** У свеце матораў.
**15.15, 19.50** Навіны рэгіёна.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Развод і дзявоцкае прозвішча». Закл. серыя (Расія).
**16.35** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Чэхія-Нарвегія. Прамая трансляцыя. У перапынку: «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**20.00** «КЕНО».
**20.10** Сфера інтэрасаў.
**20.30** Відэафільм АТН «Тыя, што спяваюць камерата».
**21.00** Панарама.
**21.55** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША). 1-я серыя.
**23.00** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Маршал Баграмян. Каханне на лініі агню».
**10.00** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Брэсцкая крэпасць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышукү». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля. Закл. серыя, 2008 г.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера. Фільм «Катоўскі». Расія, 2010 год.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Мы з будучыні». Расія, 2008 г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Маладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Ля параднага пад'езду».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Другая жонка». Італія, 1998 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Маладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дакументальны фільм «Гадар, каханне, паэзія…» (Францыя).
**11.30** «Запал па культуры».
**12.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.05** Лабірынты: сэрца змроку.
**13.40** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Венера і Апалон» (Францыя). 1-я серыя.
**14.30** Прыгодніцкі дэтэктыў «Радзіма чакае» (Расія). 1-я серыя.
**15.30** Мультфільм.
**15.40** Свая кампанія.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). Заключная серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**20.50** Калыханка.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь-Славакія. Прамая трансляцыя.
**23.30** Спорт-кадр.
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі.

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Гонар маю. Уладзімір Івашоў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.40** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.35** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Пакой смеху».
**15.10** Авантурная камедыя «Руская гульня». Расія, 2007 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Мой срэбны шар».

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «І зноў добры дзень!».
**09.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.50** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.30** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Дэсант ёсць дэсант».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Асабліва небяспечны!».
**00.45** «Футбольная ноч».

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**11.00** Веласпорт. «Тур Італіі». Амстэрдам. Мідлбург (Нідэрланды). 3-і этап.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 1-ы.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**16.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**17.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 1-ы.
**18.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 2-і.
**21.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**21.45** Футбол. Еўрагалы (Італія).
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША.
**00.00** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км (Спа-Франкашам, Бельгія). Агляд.
**01.00** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Монтмела, Каталонія/Іспанія).
**01.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** МакраФон: «Рок-карона–2009», выбранае: ч. 2.
**18.10** Басаnож па свеце.
**18.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.25** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**20.40** Хто ёсць кім?: Андрэй Курэйчык.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.45** «Каханне, здрада, жарцсь», серыял.
**22.30** Форум (ток-шоў): «Беларускія альфонсы: адкуль яны?»
**23.10** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 12 МАЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**10.05** Камедыя «Класны мюзікл» (ЗША).
**11.40** Відэафільм АТН «Бялыніцкія таямніцы» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Драма «Аўрора» (Расія-Украіна).
**14.05** Здароўе.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «OFF STAGE LIFE».
**15.40** Серыял «Блізкія людзі». 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.35** «КЕНО».
**19.40** «Зямельнае пытанне».
**20.05** Відэафільм АТН «Захоўваць вечна».
**21.00** Панарама.
**21.55** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША). 2-я серыя.
**23.00** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Катоўскі». Расія, 2010 год. Заключная серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Новыя прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Неразлучныя». Тайланд, 2007 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). Заключная серыя.
**11.35** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.20** Спорт-кадр.
**12.55** Дакументальны фільм «Мужчыны ў небяспецы» (Францыя).
**13.50** Камедыйная меладрама «Венера і Апалон» (Францыя). 2-я серыя.
**14.45** Дэтэктыўны серыял «Радзіма чакае» (Расія). 2-я серыя.
**15.40** Мультфільм.
**15.50** Медычныя таямніцы.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**19.35** Хакей. Формула гульні.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя-ЗША.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Крызісы. Прадказанні Прарока». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Ліквідацыя»».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Пасля прэм'еры - растрэл. Гісторыя адной здрады». Дак. фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кватэрнае пытанне».
**11.55** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**17.25** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Дэсант ёсць дэсант».
**21.35** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** «Следства вялі…».
**00.15** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.35** Веласпорт. «Тур Італіі». Амстэрдам. Мідлбург (Нідэрланды). 3-і этап.
**10.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 2-і.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**14.45** Веласпорт. «Тур Італіі». Амстэрдам. Мідлбург (Нідэрланды). 3-і этап.
**15.30** Веласпорт. «Тур Італіі». Савільяна-Кунео (Італія). 4-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**20.30** Абранае па серадах.
**20.40** Конны спорт. Шматбор'е (Бадмінтон, Вялікабрытанія).
**21.40** Навіны коннага спорту.
**21.45** Гольф. Тур PGA (Понтэ-Верд, ЗША).
**22.45** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Італіі (Турын).
**23.15** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Турцыі (Анталія).
**23.25** Гольф-клуб.
**23.30** Ветразевы спорт. Рэгата World Match (Марсэль, Францыя).
**00.00** Яхт-клуб.
**00.05** Абранае па серадах.
**00.15** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**00.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**01.00** Веласпорт. «Тур Італіі». Савільяна-Кунео (Італія). 4-ы этап.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.20** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 4 серыя, «Літва».
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.45** На колах.
**20.15** «Хадзіце на мой голас», рэпартаж, 2008 г.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Маю права (прававая праграма).
**21.45** Без рэтушы: «Дэструктыўная арганізацыя», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**22.05** «Украдзены цуд», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
**23.30** Аб'ектыў.

## 13 МАЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.05, 19.30, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Слова Мітрапаліта на свята Ушэсця Гасподня.
**09.15** Відэафільм АТН « Захоўваць вечна».
**10.10** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**11.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Меладрама «Старая сяброўка» (Украіна).
**14.05** «OFF STAGE LIFE».
**14.15** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**15.15, 19.50** Навіны рэгіёна.
**15.30** Уласный персонал.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Блізкія людзі» (Расія). 2-я серыя.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія-Беларусь. Прамая трансляцыя. У перапынку: «Зона Х». Крымінальная хроніка».
**20.00** «КЕНО».
**20.10** Сфера інтэрасаў.
**20.30** Відэафільм АТН «Цыгане».
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.10** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША). 3-я серыя.
**23.10** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**00.10** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**19.30** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Асяроддзе пасялення.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.10** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Лядзяш». ЗША, 2005 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** «Маё жыццё».
**11.30** Экспедыцыя.
**11.55** Бітва экстрасэнсаў.
**13.00** Хакей. Формула гульні.
**13.30** Дакументальны фільм «Чырвоны д'ябал (Беларусьфільм)».
**13.50** Камедыйная меладрама «Венера і Апалон» (Францыя). 3-я серыя.
**14.45** Дэтэктыўны серыял «Радзіма чакае» (Расія). 3-я серыя.
**15.40** Жывы гук.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**19.40** Беларуская часіна.
**20.50** Калыханка.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швецыя-Чэхія. Прамая трансляцыя.
**23.30** Час футболу.
**00.00** Культасвет.
**00.25** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Геніяльны пустэльнік. Вечная музыка Шварца». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.20** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Ліквідацыя»».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Крутыя павароты лёсу. Сяргей Захараў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Асабліва небяспечны!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.55** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Дэсант ёсць дэсант».
**21.40** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**10.00** Веласпорт. «Тур Італіі». Савільяна-Кунео (Італія). 4-ы этап.
**11.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Дзень 3-і.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**14.45** Веласпорт. «Тур Італіі». Савільяна-Кунео (Італія). 4-ы этап.
**15.30** Веласпорт. «Тур Італіі». Навара. Нові Лігурэ (Італія). 5-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**20.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). 1/8 фіналу.
**21.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**22.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Амстэрдам.
**01.30** Веласпорт. «Тур Італіі». Навара. Нові Лігурэ (Італія). 5-ы этап.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял.
**17.35** «Зазі ў метро», маст. фільм, 1960 г., Францыя–Італія.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** МакраФон: «Новая традыцыя», канцэрт гуртоў «Чэрэмош» і «Гуцульскія музыкі».
**20.35** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Форум (ток-шоу): «Святая лічба».
**22.10** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**22.55** Без рэтушы: «Дэструктыўная арганізацыя», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**23.15** Аб'ектыў.

## 16 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.15** Казка «Бібі-маленькая чараўніца» (Германія).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** «Альманах вандраванняў».
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.50** «У свеце матораў».
**11.25** «Nota Bene».
**12.10** Камедыя «Старыя разбойнікі» (СССР).
**14.00** «ПАР-2010. Бітвы кантынентальных культур».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Тыя, што спяваюць камерата».
**15.55** Прэм’ера. Меладрама «Монро» (Расія).
**17.40** OFF STAGE LIFE.
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** «Футбол. Ліга чэмпіёнаў». Відэачасопіс.
**22.40** Рамантычная камедыя «Мігель і Уільям» (Іспанія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2008 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Фазэнда».
**13.15** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** «Песні Перамогі».
**14.30** «Градка».
**15.05** Севастопальскія аповяды.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Смаленск».
**17.10** Фільм «Валер Харламаў. Дадатковы час».
**18.55** Прэм’ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Гістарычная драма «Віцэ-каралі».

**07.30** «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
**08.20** Фільм «Летнія ўражанні аб планеце Z». СССР, 1986 г. Заключная серыя.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** Фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга». СССР, 1979 г. Заключныя серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля параднага пад’езду».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Дамы ў ліловым». Вялікабрытанія, 2004 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.40** Фільм «Затоічы». Японія, 2003 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.10** Дабравест.
**07.35** Мір вашай хаце.
**07.45** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.15** Камедыйны баявік «Васабі» (Францыя).



**09.55** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.45** «Правы чалавека».
**13.00** Прыгодніцкая фантастыка «Выспа страчаных душ» (Данія-Швецыя-Германія).
**15.05** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання»(Украіна).
**16.05** Гістарычны баявік «Сем мячоў» (Паўднёвая Карэя-Ганконг-Кітай).
**19.00** Нашы тэсты.
**19.35** Экспедыцыя.
**20.05** Смешная часіна.
**20.45** Тэлебарометр.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Прамая трансляцыя.
**23.30** Свая музыка. Працяг.
**23.55** Пасоўванне+.
**00.15** Самба. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 3-і.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.55** Камедыя «Бацькі і дзяды».
**09.20** Фільм «Гувернантка». Расія, 2009 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Ранняя іржа».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** Прэм’ера. «Украінскі самурай. Прынцып Ступкі». Дакументальны фільм.
**15.40** Вострасюжэтны фільм «Піраты XX стагоддзя».
**17.10** Прэм’ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм’ера. Фільм «Моцная слабая жанчына». Расія, 2010 г.
**22.30** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.35** Фільм «Калі бракуе кахання». Расія.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.30** «Першая кроў».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм’ера. Праект «У пошуках Францыі».
**14.10** Крымінальная меладрама «Па следзе Фенікса».



**16.00** Сёння.
**16.25** «Масквічы». Тэлевізійная камедыя.
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Шэрыф».
**00.05** «Авіятары».
**00.35** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). 1/2 фіналу.
**10.45** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ ў Манака. Прамая трансляцыя.
**11.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 7-ы этап.
**12.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно ў Манака.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР (Кьяламі). Заезд 1-ы. Прамая трансляцыя.
**14.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў ПАР (Кьяламі). Прамая трансляцыя.
**15.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 8-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР (Кьяламі). Заезд 2-і.
**19.15** Мотаспорт па выходных.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Фінал.
**21.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету WBO.
**22.15** Мотаспорт па выходных.
**22.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 8-ы этап.
**23.30** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Веласпорт. Тур Каліфорніі (ЗША). 1-ы этап.
**02.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР (Кьяламі). Заезд 2-і.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.35** «Дзённік «Народнага альбома», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**19.35** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.45** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 5.
**20.00** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Мілу ў траўні», маст. фільм, 1990 г., Францыя–Італія.
**23.15** Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: з 1 мая змяніліся нашы рэквізіты ў банку. Нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11.**

**Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і пропісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org



АДУКАЦЫЯ

# РЭКВІЕМ ПА БАЛОННІ

Іван БІЧ

**Рэформа вышэйшай адукацыі ў ЕС шмат у чым правалілася, але ніхто не ведае, ці ёсць ёй рэальная альтэрнатыва.**


Audimax

Яшчэ ў сакавіку ў Вене адбыўся так званы Балонскі саміт — з'езд прадстаўнікоў міністэрстваў адукацыі краін — удзельніц Зоны еўрапейскай вышэйшай адукацыі. Мерапрыемства прызначылі яшчэ 10 гадоў таму, пасля таго, як 19 чэрвеня 1999 года ў Балонні пад пырскі шампанскага дэкларавалі стварэнне вышэйзгаданай зоны.

Яе асноўныя прынцыпы і мэты былі выкладзены ў Балонскай дэкларацыі. Зараз у Балонскім працэсе ў той ці іншай форме ўдзельнічаюць 47 еўрапейскіх краін. За бортам толькі экзатычныя Сан-Марына і Манака, а таксама Беларусь. З апошняй, праўда, не ўсё так проста. Шматлікія элементы Балонні прысутнічаюць у айчыннай сістэме адукацыі, напрыклад, двухузроўневая схема, паступовае скарачэнне колькасці бюджэтнікаў і г. д.

Заснавальнікі Балонскай сістэмы разлічвалі, што асноўныя мэты рэформы павінны быць дасягнутыя на працягу дзесяцігоддзя, а менавіта да 2010 года. Таму яшчэ тады, у 1999-м, вырашылі, што ўвесну 2010-га будзе лагічна сустрэцца, каб падвесці першыя вынікі і адсвяткаваць юбілей. Аднак святкавання не атрымалася.

Напярэдадні мерапрыемства залу, дзе павінен быў адбыцца саміт, захапілі студэнты і выкладчыкі. У дзень адкрыцця саміта 12 тысяч чалавек, якія прадстаўлялі 63 грамадскія арганізацыі, прайшліся па вуліцах аўстрыйскай сталіцы. Яны скандзіравалі: «Разам супраць разбурэння адукацыйнай і сацыяльнай сістэмы!» Паралельна прайшоў антысаміт. У акцыях у Вене прынялі ўдзел студэнты і выкладчыкі са Швейцарыі, Сербіі, Францыі, Германіі, Турцыі і іншых краін.

Студэнты кажуць пра правал рэформы. І не толькі студэнты. 24 лістапада 2009 года вядучая нямецкая газета «Frankfuter Allgemaine Zeitung» канстатавала: «Балонская рэформа — самая буйная рэформа нямецкага універсітэта з XIX стагоддзя — правалілася. Гэта прызнаюць нават адказныя за яе правядзенне асобы».

Па меркаванні крытыкаў Балонскай сістэмы, рэалізацыя рэформы вышэйшай адукацыі істотна пагоршыла ўмовы навучальнага працэсу і працы выкладчыкаў. Яе следствам сталі перапоўненыя аўдыторыі, дэфіцыт педагогаў (толькі ў ФРГ за апошнія 15 гадоў іх колькасць зменшылася на 1500 выкладчыкаў).

З-за скарачэння часу навучання да шасці паўгоддзяў шматлікія праграмы апынуліся перагружанымі. У некаторых універсітэтах студэнты павінны штотыдзень наведваць 40–50 навучальных пар. Магчымасць вучобы за мяжой (мабільнасць была адной з фішак рэформы) апынулася фікцыяй: такую вучобу цяжка адаптаваць да навучальных планаў.

У сярэднім каля 60 працэнтаў студэнтаў у Еўропе павінны аплачваць сваё навучанне. Ім складана падагнаць графік працы пад расклад семінараў і паходаў у бібліятэкі. Шматлікія навучэнцы папросту не вытрымліваюць такога стрэсу. На некаторых факультэтах да апошняга года навучання дацягвае толькі траціна абітурыентаў.

Найбольш спрэчнай апынулася ідэя двухузроўневага навучання. Першы цыкл вучобы працягваецца не менш трох гадоў. Тыя, хто скончыў курс, атрымліваюць дыплом бакалаўра. Тыя, хто прайшоў другі цыкл, атрымліваюць ступень магістра. Як паказала практыка, працадаўцы ўпарта не ўспрымаюць бакалаўраў у якасці прафесіяналаў, трымаюць іх за недавукаў і, адпаведна, плацяць ім менш.

Апошнія, магчыма, і не супраць стаць магістрамі, але залічаюць туды далёка не ўсіх. Прычым магістратура каштуе дадатковых грошай.

**Заснавальнікі Балонскай сістэмы разлічвалі, што асноўныя мэты рэформы павінны быць дасягнутыя на працягу дзесяцігоддзя**



Дарэчы, камерцыялізацыя навучання з'яўляецца складовай часткай Балонскай сістэмы. Аўтары сістэмы меркавалі, што ператварэнне універсітэтаў у рынкавыя суб'екты дапаможа разгрузіць нацыянальныя бюджэты. Цяжкі матэрыяльны стан ВНУ прывёў да росту ролі карпарацый і фірмаў, якія заказваюць універсітэтам розныя даследаванні. Ахвярай такой практыкі сталі цэлыя навуковыя кірункі, першым чынам гуманітарныя. У 2005 годзе 21 працэнт усіх ВНУ ў ЕС залежаў ад кантрактаў з карпарацыямі. Універсітэт, арыентаваны на выкананне замовы, перастаў быць пляцоўкай дыскусіі. Яго выпускнікі пазбаўлены крытычнага мыслення.

Агульная фрустрацыя ў аўдыторыях і на кафедрах з надыходам крызісу перарасла ў адкрытыя пратэсты. Самымі нестрыманымі апынуліся немцы і аўстрыйцы. Менш за ўсё бунту чакалі ад апошніх.

Беспарадкі пачаліся 20 кастрычніка 2010 года, калі студэнты і выкладчыкі занялі галоўную залу Венскай акадэміі мастацтваў. 22 кастрычніка хваляванні перакінуліся ў корпусы Венскага універсітэта. Audimax — памяшканне ў будынку універсітэта, акупаванае студэнтамі і пераўтворанае ў своеасаблівы штаб, дало найменне ўсяму руху. Яго сталі называць Audimaximus. Пазней гэта слова было названае словам года.

На працягу некалькіх дзён геаграфія пратэстаў значна пашырылася: Інсбрук, Лінц, Зальцбург, Грац і г.д. З самага пачатку пратэстуючыя адмовіліся ад цвёрдай вертыкальнай арганізацыі. Галоўную інфармацыйную функцыю выконваў інтэрнэт. Абмеркаванне тактыкі таксама праходзіла на агульных пленумах. Важную ролю адыгрывалі рэгулярныя супольныя дэманстрацыі і незвычайныя перформансы, напрыклад, захоп 24 лістапада сцэны Венскага грамадскага тэатра падчас аднаго са спектакляў.

Вельмі хутка пачаўся «імпарт рэвалюцыі». 5 лістапада ў ФРГ прайшоў агульнанацыянальны студэнцкі страйк. Былі захоплены памяшканні ў 70-ці універсітэтах. 25 лістапада акцыі салідарнасці з аўстрыйцамі прайшлі па ўсім свеце.

Пратэсты скончыліся толькі на пачатку студзеня. Пакуль галоўнай перамогай студэнтаў стала скарачэнне платы за навучанне і стварэнне адмысловых парламенцкіх камісій па пытанню адукацыі. Але гэта яшчэ далёка не канец.

Цяпер у Еўропе актыўна ідзе дыскусія наконт альтэрнатывы Балонскай сістэме. Рэалісты прапануюць для пачатку абмежавацца рэформамі. Праграма-мінімум выглядае наступным чынам: аднавіць старыя навучальныя планы і тэрміны навучання, скасаваць інстытут бакалаўраў, пашырыць студэнцкае самакіраванне, павялічыць памер дзяржаўных датацый універсітэтам.

Радыкалы бачаць коранем бед арыентацыю Балонскай сістэмы на запыты рынку. Гэта фракцыя заклікае да стварэння новай мадэлі універсітэта.

У любым выпадку, і першыя і другі прызнаюць, што іхнія патрабаванні могуць быць пачутыя толькі ў выпадку існавання моцнага грамадзянскага супрацiву. Таму ў чэрвені 2010 года (так было вырашана на сакавіцкім антысаміце ў Вене) ва універсітэтах Еўропы пачнецца новая кампанія пратэстаў.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Адносіны ў трыкутніку Беларусь — Украіна — Расія будуць развівацца няпроста. База для беларуска-ўкраінскага альянсу аб'ектыўна існуе, і дадзены альянс — вольна ці міжволі — закліканы, у тым ліку, і супрацьстаяць расійскаму ціску. Аднак ні Украіна, ні Беларусь сёння не змогуць існаваць без цесных эканамічных і звычайных палітычных узаемаадносін з Расіяй. Пройдзе яшчэ не адзін год, пакуль утрасецца вось гэта постсавецкая ломка і краіны ад узаемных нерэальных пражэктаў (кшталту славянскай інтэграцыі) пяройдуць да празрыстых і цывілізаваных узаемаадносін.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Скінуты нядаўна прэзідэнт Бакіеў, які збег у Мінск, адмаўляецца сыходзіць у адстаўку. Новы ўрад у Бішкеку патрабуе выдаць Бакіева, які мусіць адказваць перад судом па абвінавачванню ў забойствах. Пры гэтым кіргізскія ўлады добра разумеюць, што беларускі дыктатар Лукашэнка ніколі не выдасць свайго госця.

**«Suddeutsche Zeitung» (Германія)**

У сваю чаргу, беларускае кіраўніцтва сёння ўпэўненае ў тым, што палітыка ЕС накіраваная не на змену рэжыму, а на яго доўгую эвалюцыю ў працэсе ўзгаднення пазіцый. Ніякай рызыкі страты суверэнітэту ў выбудоўванні партнёрскіх адносін з Бруселем няма. Менавіта такім шляхам адкрываецца прамая дарога да міжнароднай легімітызацыі беларускай эліты ў якасці кіруючага пласта незалежнай еўрапейскай дзяржавы, што з'яўляецца яе непасрэднай задачай.

**Політ.ру (Расія)**

Невядома, чыё жаданне інтэгравацца з Расіяй большае: новага ўкраінскага кіраўніцтва ці беларускага? Можна выказаць здагадку, што ў афіцыйнага Мінска жадання больш, але вось у Кіева цяпер — прыкметна большыя рухі! І ён з аўтсайдэраў у адносінах з Расіяй нечакана выходзіць у фаварыты. Папросту таму, што яго рух тут жа памнажаецца рухам Расіі — закон узаемнасці!

**«Regnum» (Расія)**

Нават рэзкія антырасійскія выказванні не змянілі ў вачах еўрапейцаў адмоўнага стаўлення да Бацькі як да «апошняга дыктатара Еўропы», які парушае асноўныя правы чалавека. За паўтара гады пацяплення адносін паміж Беларуссю і ЕС еўрапейскія палітыкі так і не прывыклі да Лукашэнкі, хоць і намагаліся фліртаваць з ім увесь гэты час. Логіка дзеянняў гэтага чалавека так і засталася для іх незразумелай.

**«Правда.ру» (Расія)**

Калі казаць пра больш дэмакратычна абраны парламент Грузіі, то можна з упэўненасцю сказаць, што там бы не сталі прымаць рашэнні, якія б не спадабаліся афіцыйнаму Мінску. Гэта наўрад ці было б магчыма, калі б Беларусь прызнала сепаратысцкія рэжымы ў Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Да таго ж, нягледзячы на афіцыйны выхад Грузіі з СНД, у яе з Беларуссю працягвае функцыянаваць бязвізавы рэжым. Кіраўніцтва дзвюх краін без лішняга шуму хутка падпісала адпаведныя дакументы. Прэзідэнту Саакашвілі няма падстаў крыўдзіцца на свайго беларускага калегу. У гэтым у выканаўчай і заканадаўчай галін улады ў Грузіі поўная аднадушнасць. Як і, вобразна кажучы, у беларусаў стаўленне да «Баржомі», якое яны могуць свабодна і з задавальненнем піць сабе на здароўе.

**«Delfi» (Літва)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КАЗАХСТАН. НЕВЯДОМЫ РАМАН МАЛАДОГА НАЗАРБАЕВА



Казахская служба «Радыё Свабода» апублікавала рамантычную гісторыю пра невядомае каханне Нурсултана Назарбаева да кіргізкі Туран. У 1961 годзе малады сталявар Нурсултан прыехаў у Фрунзе (так тады называўся Бішкек), каб прапанаваць руку і сэрца знаёмай свайго сябра Марата. Але Нурсултана чакала фіяска: бацька дзяўчыны не захацеў аддаваць дачку «ў далёкі Казахстан». І тады абражаны Нурсултан тут жа закруціў раман з лепшай сяброўкай Туран. Аднак гэта не спадабалася Марату. Ён напісаў Назарбаеву ліст пра тое, што дзяўчына знайшла сабе хлопца, і раўнівы Нурсултан перапыніў адносіны. Вось такая вартая Шэкспіра гісторыя. Хто ведае, як склалася гісторыя Казахстану, калі б не інтрыгі Марата?

**Па матэрыялах казахскай службы «Радыё Свабода»**

### УКРАІНА. 90 ГАДОЎ САЮЗУ

Грамадскасць Украіны адзначыла цікавы юбілей. 21 красавіка 1920 года ў Варшаве быў падпісаны пакт паміж урадамі Польскай Рэспублікі і Украінскай Народнай Рэспублікі, вядомы як дамова Пілсудскага—Пятлюры. Паводле дамовы, дзве нядаўна створаных дзяржавы, якія паспелі ўступіць ва ўзброены канфлікт паміж сабой, узаемна прызнавалі незалежнасць, урэгулёўвалі памежныя пытанні і, галоўнае, дамаўляліся пра ваенны саюз у барацьбе супраць агульнага ворага — бальшавіцкай Расіі. Саюз праіснаваў амаль год і распаўся пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы паміж РСФСР і Польшчай. І тады, і цяпер стаўленне да гэтага пакта і ва Украіне, і ў Польшчы неадназначнае. Пакт з Пілсудскім доўгі час быў важнай зброяй савецкай прапаганды. У абмен на вайсковую падтрымку Пятлюра пагадзіўся прызнаць часткай Польшчы Заходнюю Украіну. Аднак зараз з'явіліся новыя трактоўкі чыну Пятлюры. Некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што пакт стаў прарывам для ўкраінскай дыпламатыі. Ён даў магчымасць хаця б часова захаваць незалежнасць Украіны. Акрамя таго, сумесная гераічная барацьба палякаў і ўкраінцаў не дала бальшавікам шансу прарвацца ў Еўропу. Цяжка сказаць, наколькі новыя аргументы змогуць рэабілітаваць Пятлюру ў свядомасці перш за ўсё заходніх украінцаў, якія ў 1920–1930-я гады вялі барацьбу супраць Варшавы.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### МАЛДОВА. НАШЧАДАК СТЭФАНА ВЯЛІКАГА ПАТРАБУЕ ВЯРНУЦЬ СПАДЧЫНУ

29-гадовы румынскі грамадзянін Карнел Чэрноскі абвясціў сябе нашчадкам гаспадара Стэфана Вялікага і патрабуе ў судзе «вярнуць» яму валоданне продка — Малдову. Чэрноскі падаў іск у суд Бухарэста і накіраваў аналагічныя патрабаванні прэзідэнту краіны, ва ўрад і ў парламент Румыніі. Па закону, заява прынятая, і зараз, пасля выканання неабходных працэдур, суддзі павінны вынесці па ёй рашэнне. Сваё незвычайнае патрабаванне Карнел абгрунтоўвае тэкстам завяшчання свайго далёкага продка, у якім быццам сцвярджаецца, што Малдова павінна належаць яговым нашчадкам. Чэрноскі кажа, што радасную вестку пра яго кроўную блізкасць са Стэфанам Вялікім яму паведаміла перад смерцю бабуля. У выпадку перамогі ў судзе, Чэрноскі абяцае перанесці сталіцу Малдовы з Кішынёва ў Ясы ці Сучаву (гістарычныя сталіцы сярэднявечнага Малдаўскага княства). У выпадку пройгрышу, ён мае намер звяртацца ў Еўрапейскі суд па правах чалавека і іншыя міжнародныя судовыя інстанцыі.

**Па матэрыялах «Новая газета» (Малдова)**

### ІЗРАІЛЬ. ПАМЕР КАРОЛЬ БРУДНАГА ІЗРАІЛЬСКАГА ГУМАРУ



У адной з ізраільскіх турмаў павесіўся Дуду Тапаз — культавы комік, жарты якога шмат у чым былі пабудаваныя на высмейванні габрэяў — эмігрантаў з Усходу і з краін былога СССР. У 1981 годзе ён стаў «нацыянальным героем», заявіўшы на мітынгу адной правай партыі: «Тут сабраліся выключна прыстойныя людзі. Няма ніводнага чахчаха» (так у Ізраілі пагардліва называюць усходніх габрэяў). Шмат разоў ахвярамі яго жартаў былі эмігранты з СССР. Як не дзіўна, народу гэта падабалася. Падобныя жарты амаль трыццаць гадоў забяспечвалі Дуду высокі рэйтынг на ізраільскім тэлебачанні. Але з часам рэйтынг ў Дуду сталі прасядаць. Ён рэагаваў на гэта вельмі эмацыйна: разбіў акуляры супрацоўніку студыі, укусіў адну зорку і, нарэшце, збіў свайго боса. Расправу над шэфам Дуду не прабачылі. Коміка кінулі за краты, дзе ён павесіўся на шнуры ад электрычнага чайніка.

**Па матэрыялах «Life Journal»**

ВЫБАРЫ

# АГОНІЯ «ПОЛЬСКАГА ЛУКАШЫЗМУ»

**Алег НОВІКАЎ**

**Як бы ні закончыліся прэзідэнцкія выбары ў Польшчы, ужо зараз відавочны катастрафічны правал на іх Анджэя Лепера — палітыка, якога ў свой час называлі польскім Лукашэнкам.**



Погляды віцэ-прэм'ера Польшчы Анджэя Лепера (на першым плане) і прэм'ера Яраслава Качыньскага на будучыню краіны ў чарговы раз разышліся

Напрыканцы красавіка адно з вядучых польскіх выданняў «Gazeta Wyborzca» апублікавала вынікі апытання грамадзян: «За каго вы б прагаласавалі, калі б заўтра было 20 чэрвеня?» (у гэты дзень у Польшчы адбудуцца прэзідэнцкія выбары).

Галоўнай сенсацыяй даследавання можна лічыць дастаткова вялікі адрыў Браніслава Камароўскага, кандыдата ад ліберальнай «Грамадзянскай платформы» (52 працэнты), ад Яраслава Качыньскага, які прадстаўляе партыю «Права і справядлівасць» (29 працэнтаў). Праўда, сам брат загінулага пад Смаленскам прэзідэнта абяцае хутка скараціць адставанне.

Аналізуючы вынікі зандажу грамадскай думкі, нельга не звярнуць увагу на мікраскапічны рэйтынг Анджэя Лепера, кандыдата ад партыі «Самаабарона». Ягоны рэйтынг ніжэйшы за адзін працэнт. Такія лічбы здаюцца дзіўнымі.

Па-першае, на двары эканамічны крызіс. У Польшчы каля двух мільёнаў беспрацоўных, і гэта без уліку іншых ахвяр рэцэсіі. Праграма «Самаабароны» абяцае гэтым людзям залатыя горы ў выпадку, калі дарвецца да ўлады.

Па-другое, здзіўляюць тэмпы палітычнай маргіналізацыі «Самаабароны». Нават калі гаворка пра Польшчу, дзе перазагрузка палітычнай сцэны — звычайная з'ява.

Яшчэ тры гады таму Лепер быў віцэ-спікерам Сейма. У 2005 годзе ён набраў у першым туры прэзідэнцкіх выбараў 15 працэнтаў. «Самаабарона» мела сваіх міністраў, фракцыі ў рэгіянальных парламентах. Палітолагі дружна абмяркоўвалі феномен «Самаабароны», а некаторыя замежныя палітыкі адкрыта займаліся палітычным плагіятам. Так, Юры Луцэнка — адзін з лідэраў украінскіх аранжавых — назваў сваю партыю «Народная самаабарона». І вось цяпер папулярнасць Лепера стала ніжэйшай за адзін працэнт.

Увогуле, партыя «Самаабарона» ўзнікла ў 1992 годзе на базе сялянскага прафсаюза з аналагічнай назвай. Акрамя сялян у партыю ўвайшла група нацыяналістаў і супрацоўнікаў спартовых ведамстваў.

На першым этапе сябры партыі разглядалі сябе як палітычную надбудову прафсаюзу, які праславіўся акцыямі наўпроста дзеяння супраць ліберальнай палітыкі правых кабінетаў Ганны Сухоцкай і Ежы Бузэка.

«Самаабарона» набыла вядомасць дзякуючы сваім акцыям кшталту блакады аўтамабільных трас. Адну з іх — траса нумар 39 — у народзе нават пачалі называць «лепераўка». Менавіта тады на рубяжы стагоддзяў Анджэй Лепер — былы фермер, які падаўся ў палітыку з-за таго, што ягоная гаспадарка ў выніку рэформаў аказалася на мяжы банкруцтва, стаў прыкметнай фігурай.

На выбарах 2001 года ў Сейм «Самаабарона» сабрала добры ўраджай — 10 працэнтаў галасоў, што дало партыі 53 мандаты. Па выніках 2005 года партыя ўвогуле стала трэцяй палітычнай сілай у краіне.

Апынуўшыся ў парламенце, самаабаронаўцы спачатку разглядалі сябе партнёрамі Саюза левых дэмакратаў (SLD). Але ў 2003-м партыя рэзка змяніла курс. Лепер гучна пасварыўся з прэм'ерам Лешэкам Мілерам (SLD) па пытанню адпраўкі палякаў у Афганістан і Ірак і разарваў усе кааліцыі з SLD на месцах. А пасля пачаў актыўна ўдзельнічаць у працы камісіі, якая займалася аферай Рывіна (буйны карупцыйны скандал з удзелам кіраўніцтва SLD). У экстазе нянавісці да левых Лепер падтрымаў кандыдатуру Леха Качыньскага ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў 2005 года.

Пачалася эра супрацоўніцтва з кансерватарамі. Лепераўцы ўвайшлі ў кабінет Яраслава Качыньскага, атрымаўшы там тры міністэрскія партфелі. Аднак як толькі папулярнасць Качыньскага пачала падаць, «Самаабарона» зноў распачала скандаліць — выйшла з ураду, каб пазней туды вярнуцца, а пасля зноў думаць, ці не адправіцца ў аўтаномнае плаванне.

Калі ў 2007 годзе надышоў час парламенцкіх выбараў, партыя Лепера пайшла на іх пад левымі лозунгамі. Аднак такі крэн налева не даў вынікаў: атрымаўшы 1,5 працэнта, партыя апынулася па-за Сеймам.

Такі правал, праўда, можна часткова было спісаць на гучны сексуальны скандал з удзелам старшыні партыі. У 2006 годзе адна з партыйных клеркаў заявіла журналістам, што атрымала пасаду за тое, што аказвала Леперу і іншаму партыйнаму функцыянеру «сексуальныя паслугі».

Лепер трактаваў споведзь як частку змовы супраць яго намераў пазнаёміць грамадства з некаторымі аферамі 1990-х гадоў. Аднак яго калега рэагаваў інакш — адразу падаў у адстаўку. Хутка на Лепера завялі справу. Увогуле, наш герой быў фігурантам 139 судовых працэсаў. Але судзілі яго звычайна не за секс з сакратаркамі, а за арганізацыю нелегальных акцый, бойкі з паліцыяй або брудныя словы на адрас палітыкаў з істэблішменту.

Аднак захад «Самаабароны» пачаўся яшчэ ў 2007 годзе, калі частка кіраўніцтва партыі пасля сексуальнага скандалу паклала партбілеты на стол. Заставалася яшчэ нейкая надзея на выбары ў Еўрапарламент 2009 года, але яны хутчэй замацавалі тэндэнцыю — «Самаабарона» атрымала на іх 1,4 працэнта. Для параўнання, у 2005-м на выбарах у парламент ЕС у партыі было 10,7 працэнта.

Ужо ёсць падставы казаць: праект «Самаабароны» праваліўся, і шукаць прычыны яго правалу трэба не толькі ў тым, што Лепера злавілі на інтыме.

Калапс «Самаабароны» — гэта відавочна крах мадэлі палітычнага папулізму, які ўзнік пасля развалу СССР у краінах Усходняй Еўропы. Не дарма стыль і рыторыку Лепера часта параўноўвалі з Лукашэнкам або Вітрэнка. Складнікамі гэтага стылю была харызматычнасць, імправізацыя, гульня на настальгіі і фобіях да ўсяго новага. Цяперашняя актыўная частка грамадства вырасла на іншых культурных фішках і каштоўнасцях.

Наўрад ці папулізм цалкам знікне як феномен усходнееўрапейскай палітыкі, аднак час Лепера і яму падобных палітыкаў дакладна мінуў.

СІТУАЦЫЯ

# ЧОРНЫЯ, А НЕ БЛАКІТНЫЯ

Алег ПЯТРОЎ

**Афрыку ахапіла нябачаная хваля гамафобіі, за якой, на думку аглядальнікаў, хаваецца банальная нянавісць да багатай Еўропы.**

Трапіў пад раздачу і класік рок-музыкі сэр Элтан Джон. Спявак павінен быў даць прыватны канцэрт у Егіпце. Нечакана ў арганізацыю канцэрта ўмяшаўся мясцовы Саюз кампазітараў. Старшыня саюза папрасіў улады адмяніць выступ (у егіпецкім заканадаўстве ёсць артыкул, які надае кампазітарам права забараняць гастролі замежных музыкаў). Па словах аднаго з кампазітараў, для забароны выступу спявака ёсць шэраг прычын: «Элтан Джон — гей. Ён сказаў, што Ісус быў таксама гей. Акрамя таго, ён крытычна ставіцца да рэлігіі».

Яшчэ больш напружаная сітуацыя ў Чорнай Афрыцы. Не так даўно па ўсіх каналах паказалі кадры маніфестацый ва Угандзе. Іх удзельнікі патрабавалі ад Вашынгтону і Лондану не ўмешвацца ва ўнутраныя справы краіны. Мелася на ўвазе негатыўная рэакцыя ЗША і Вялікабрытаніі на нядаўна прыняты закон пра смяротнае пакаранне для садамітаў. Вялікабрытанія ўнесла дэпутатаў — аўтараў закона, у спіс тых, каму забаронены ўезд на тэрыторыю краіны. Аднак той бок таксама не збіраецца здавацца. Як заявіў у інтэрв'ю «New York Times» адзін з тых дэпутатаў: «Калі б мой сын быў геем, я б яго забіў».

Апісаныя гісторыі — самыя вядомыя і гучныя выпадкі праяў істэрыі, якая ахапіла сёння Чорны кантынент.

У авангардзе бітвы за мараль ідзе Зімбабве, якой ужо 30 гадоў жалезнай рукой кіруе дыктатар Мугабе. У 1987 годзе нешта падштурхнула Мугабе заняцца праблемай геяў. Выступаючы на мітынгу з нагоды Дня незалежнасці, Мугабе прысвяціў вялікі блок прамовы сексуальным меншасцям, якія, па яго словах, паводзяць сябе «горш, чым сабакі і свінні».

З тых часоў барацьба з геямі стала любімай тэмай афіцыйных СМІ. На яе старонках усіх апанентаў Мугабе называюць «блакітнымі». Цікава, што апазіцыя прыняла правіла гульні. Яна, у сваю чаргу, раскручвае выпадак, калі адзін з апаратчыкаў дзяржаўнай партыі ZANU-PF быў застуканы ў ложку са сваім шафёрам.

Адначасова з дзяржаўнай прапагандысцкай кампаніяй супраць геяў быў падпраўлены Крымінальны кодэкс, які і так утрымліваў пункт пра пакаранне за «ненатуральны сексуальны акт». Зараз таксама забаронена людзям аднаго полу трымаць адзін аднаго за руку і класці руку на плячо. У дадатак крыміналам прызнана трыманне антымаральнай літаратуры.

Мясцовай арганізацыяй геяў і лесбіянак GALZ займаецца спецыяльны аддзел разведкі. Актывістаў GALZ увесь час збіваюць, кідаюць за краты і нават гвалцяць. Заснавальнік арганізацыі даўно асуджаны на 10 год за садамію. Праўда, геі, трэба прызнаць, аказваюць супраціў. Як мінімум двойчы падчас замежных візітаў Мугабе быў аб'ектам атак раз'юшаных геяў, якія намагаліся адпомсціць дыктатару за сваіх калег у Зімбабве.

Дарэчы, праз ціск на геяў. У грамадзян Зімбабве, ахвочых атрымаць палітычны прытулак за мяжой, узнікла мода называць сябе гомасексуалістамі. У 2009 годзе амерыканскі суд упершыню прызнаў аднаго з уцекачоў з Зімбабве фальшывым геям. У фармулёўцы прысутнічае цікавая фраза пра тое, што той мужчына не гей, паколькі не праяўляе ў паўсядзённым жыцці адпаведную сексуальную арыентацыю.

Так ці інакш, статыстыка ўражвае: сёння ў 37 з 53 афрыканскіх дзяржаў гомасексуалізм афіцыйна забаронены. Аглядальнікі адзначаюць, што падобныя меры ў газетах называюць «абарона грамадства», і ўспрымаюцца яны ў соцыуме з вялікім энтузіязмам. У пераследзе геяў удзельнічаюць прафсаюзы, журналісты, юрысты, жаночыя арганізацыі.

Што хаваецца за феноменам? Наўрад ці купка геяў пагражае грамадскай маралі афрыканскіх краін, хаця б з таго, што традыцыі плямёнаў часам не менш супярэчаць прынцыпам той самай маралі. Дастаткова згадаць ранняя і часам прымусовыя шлюбы для дзяўчынак. Звычайна іх аддаюць у шлюб з 12 гадоў.

Больш таго, гомасексуалізм быў таксама доўгі час часткай мясцовай традыцыі. Так, у аднаго з плямёнаў на тэрыторыі цяперашняга Зімбабве лічылася нармальным, калі стары рабіў «гэта» з маладым, каб атрымаць ад яго нейкі ген маладосці. Амерыканскія сацыёлагі ўстанавілі, што як мінімум 50 народаў рэгіёну практыкавалі нешта падобнае.

Усё закончылася з прыходам у XIX стагоддзі еўрапейцаў, якія жылі па канонах Віктарыянскай маралі. Каланізатары не толькі забаранілі падобныя рэчы, аднак са спасылкай на тагачасную медыцыну давалі туземцам, што займацца чымсьці падобным могуць выключна хворыя на галаву людзі.

Сёння Еўропа назірае цікавы эфект бумерангу. Нетрадыцыйную сексуальную арыентацыю афрыканцы сімвалічна звязваюць з еўрапейскай цывілізацыяй, дзе сексуальныя меншасці карыстаюцца значнымі правамі. Той жа Мугабе называе садамію прадуктам белага каланіялізму. Гамафобія ператварылася, як піша Дэвід Шварц у нямецкім «Jungle World», у своеасаблівую дактрыну сучаснага антыкаланіяльнага руху. Афрыканскія рэжымы кампенсуюць эканамічную залежнасць ад Еўропы і ЗША за кошт культурных акцый.

Чым скончыцца паход супраць геяў, цяжка сказаць, паколькі гарызонты бітвы папросту неабсяжныя. На мінулым тыдні група егіпецкіх юрыстаў выступіла за забарону кнігі казак «Тысяча і адна ноч», якая ўтрымлівае, на іх думку, занадта шакуючыя інтымныя сцэны.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### МОШЭ ХІРШ

У Іерусаліме ва ўзросце 86 гадоў памёр вядомы «рабін-антысіяніст», менавіта такая мянушка была ў Хірша. Ён быў самай «паршывай авечкай» сярод рабінаў, якія звычайна падтрымліваюць Ізраіль. Хірш пераехаў на Усход з ЗША і пасля вучобы стаў лідэрам секты «Neturei Karta». Адэпты гэтай секты выступаюць за знішчэнне дзяржавы Ізраіль і перадачы яе тэрыторый арабам. Такі падыход яны тлумачаць спасылкамі на Біблію, якая быццам забараняе габрэям мець уласную дзяржаву да прыходу месіі. Натуральна, ізраільскія экстрэмісты не прабачылі Хіршу падобных фокусаў. Падчас адной са службаў, якую вёў Мошэ, у сінагогу ўварваўся фанатык і выбіў рабіну вока. Наколькі Хірша не любілі афіцыйныя габрэйскія ўлады і ізраільская грамадскасць, настолькі ён падабаўся арабскім палітыкам. Ясір Арафат у 2004 годзе нават даў яму пасаду міністр па габрэйскіх справах у сваім кабінеце. Мошэ захаваў міністэрскі партфель і ў складзе цяперашняга ўраду Палесціны пад кіраўніцтвам Махмуда Абаса, у якім, праўда, ён адказваў за пытанне Іерусаліма.

### АРАКАПАРАМБІЛ КУРЫАН ЭНТАНІ



Міністр абароны Індыі вырашыў выкарыстаць у мэтах абароны радзімы 83-гадовага ёга Прахлад Джані. Апошні прыкладна 70 гадоў не бярэ ў рот ані ежы, ані вады. Пры гэтым стары выглядае дастаткова добра. Мінабароны Індыі зацікавілася сакрэтамі ёгаў. Яны прапанавалі Джані двухтыднёвае медычнае даследавання, на базе якога будзе створаны спецыяльны курс для рэкрутаў, што павінны будуць вучыцца доўгі час не спажываць ежу. Сам ёг кажа, што забяспечвае арганізм неабходнай для жыцця энергіяй за кошт простай медытацыі і паўтарэння сакральнага для індуістаў слова «Ом». Аднак вайскоўцы не вераць у тое, што сакрэт старога ў гэтым. На іх думку, арганізм ёга хавае сакрэт, які можа ў будучым стаць тайнай зброяй індыйскага войска.

### МІХАІЛ СААКАШВІЛІ



Адміністрацыя прэзідэнта Грузіі рэзка раскрытыкавала анкету перапісу насельніцтва Расійскай Федэрацыі, што пройдзе ў гэтым годзе. У ёй згадваюцца назвы 12 этнасаў, якія, на думку афіцыйнага Тбілісі, з'яўляюцца на самай справе грузінамі. Калі верыць стваральнікамі анкеты, у Расіі жывуць аджарцы, лазы, мегрэлы, гурыйцы, катэхінцы, месхі, сваны і г.д. Па-сутнасці, гэта тое ж самае, калі б расіянам беларускага паходжання прапанавалі называць сябе не этнічнымі беларусамі, а радзімічамі або крывічамі. Як лічаць у Тбілісі, такімі крокамі Крэмль марыць раскалоць грузінскую нацыю і намагаецца скараціць колькасць грузін у афіцыйнай статыстыцы. Гэтым каманда Саакашвілі не абмежавалася. Як піша блізкая да ўраду прэса, ідэю падзяліць грузін на 12 плямён прыдумала апазіцыя, якая даўно абрала Маскву ў якасці своеасаблівага цэнтру, які актыўна кансультуе расійскія ўлады.

ДАТА

# ДЗЕЦІ ТОЙ ВАЙНЫ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Пад грукат бронетэхнікі па мінскіх вуліцах як ніколі хораша думаецца пра лёсы асобных, выпадковых для вайны людзей, якіх яна засмактала. Магчыма, гэта папросту рэфлекторная рэакцыя на жудасны сам па сабе гук сотні танкаў, якія ўночы праязджаюць па горадзе. Гук, які так пужае малых дзяцей.**

Адзін з аспектаў акупацыі Беларусі фашыстамі — філасофскі. Людзі перажылі голад, здзекі, смерць родных, але знайшлі ў сабе сілы даравацы акупантам.

Яркі прыклад такога даравання — творчы шлях Васіля Сёмухі. У 1942 годзе васьмігадовага палешуцкага хлопчыка ледзь не спалілі жыўцом разам з родным хутарам Ясенец, што на Пружаншчыне. Яго бацькоў за сувязь з партызанамі расстралялі немцы. А ў 1991-м ён — кавалер ордэна за асаблівыя заслугі перад ФРГ — за пераклад на беларускую мову «Фаўста» Ё. В. Гётэ. Асярожныя спробы распытаць пра ўзаемасувязь паміж першым і другім фактамі прывялі да гэтай публікацыі, якую прысвячаем памяці пра ТУЮ ВАЙНУ.

### «З узлесся я бачыў, як гарэў наш хутар»

***— Спадар Васіль, адкуль у вас цікавасць да моваў?***

— Усё пайшло ад мамы. Мама Марыя, сялянка з вёскі Куплін (паўтара кіламетра ад Пружаны). Вучылася ў Пружане (ці тое ў школе, ці ў гімназіі). Ведала рускую мову (граматна перапісвалася з братам, які жыў у Амерыцы), польскую (а як жа інакш у польскай гімназіі?), ідыш (70 працэнтаў жыхароў Пружаны былі габрэі), нямецкую (школа ці гімназія), сама палешка і дома гаварыла толькі па-палеску. Добра шыла і мела з таго неблагі прыбытак.

Выйшла замуж за палешука Сяргея з хутара Ясенец, ліцвіны яго называлі чамусьці Парасліна: там яны, з ружанскіх вёсак, летам касілі сена на балотах. Гэта паўднёвая ўскраіна Ружанскай пушчы, якая ёсць працягам Белавежскай. На паўночным баку пушчы былі ўжо ліцвіны, дзе былі замужам дзве бацькавы сястры. Яны ўжо гаварылі па-ліцвінску (па-беларуску). Такое вось моўнае памежжа! Бацька быў леснікам у пушчы з нейкім дзіўным для селяніна хобі: майстравіты мужык, рабіў струнныя інструменты (гітары, мандаліны, балалайкі) і розныя іншыя такарныя штучкі. Таксама неблагі прыбытак. І, натуральна, — сялянская гаспадарка.

***— Раскажыце пра першыя кантакты з нямецкай мовай.***

— З першых дзён вайны я ўжо ведаў, што немцаў трэба баяцца, фактаў хапала. А першая сустрэча адбылася ўзімку. Мама тчэ кросны. Я сяджу каля яе злева (любіў пускаць чаўнок па нітках. Любіў сукаць цэўкі на машынцы. І тут наехалі немцы з суседняй вёскі Смаляніцы (там была камендатура з гарнізонам, і там жыла мая цётка Ганна). Усчаўся гвалт. У пакой зайшоў немец і прыступіўся да мамы, пачаў распытваць, наставляючы пісталет да скроні то ёй, то мне. Абое гаварылі па-нямецку. Я быў тадыташні, а не сённяшні, таму нічога не зразумеў. А на кухні тым часам білі тату, чуліся крыкі, потым стрэл — гэта застрэлілі сабаку Мэру. На гэты стрэл немец выйшаў і больш не вярнуўся. Гэта было першага разу, калі я пачуў нямецкую гаворку.

Другі раз — ужо летам 1942 года. Прачнуўся раніцай ад нямецкіх галасоў. Ляжаў з галавою накрыты коўдрай, пачуў з другога пакоя і хуценька шмыгнуў пад ложак. Там сядзеў, а яшчэ больш спаў ад страху трое сутак, пакуль немцы былі на хутары. Пасля яны кагосьці абстралялі на ўлессі і засаду знялі. Са Смаляніцы прыгналі падводы вывозіць усё хатняе і быдла. Сярод падводчыкаў была і мая цётка Ганна. Яна і выкалупала мяне з-пад ложка. Бацькоў яшчэ першае раніцы арыштавалі і звезлі ў Смаляніцу. Цётка пазней казала, што ў сяле мама ёй крыкнула: «Ганно, там Вася зостаўся». Таму яна і напрасілася ў падводы. Пасадзіла мяне на воз, загрузілася чым там прыйшлося і паехала з абозам, а з узлесся я ўжо бачыў, як гарэў наш хутар. З паўгода цёця лячыла мяне і вадзіла да знахарак і шаптух. «Од пэрэляку ліэчыла і одкачвала», — казала. Гэта першы раз, калі я вось такім чынам уратаваўся.

***— Былі яшчэ ўратаванні?***

— Другі раз — зімою ў Смаляніцы. Запісалі нас (цёця, яе двое дзяцей і я) на вываз у Германію. Павезлі ў Пружану. А там ужо каля сотні падвод з сем'ямі з усёй Пружаншчыны. Там ладзілі так званую селекцыю. Зайшлі мы ўсе раздзетыя па пояс: абапал каля сцены сталы з, мабыць, дактарамі. Паглядзелі на нас, сказалі маёй стрыечнай сястры, семнаццацігадовай Мані ісці ў той пакой, нам — «гівэк» (г. зн.: «Geh weg!» — «Прэч!»).

Маню забралі, цёця ўся ў слёзах выйшла на двор, запрэгла коніка і рушыла да брамы. Вартавы спакойненька адчыняе, мы выехалі і падвечар былі ў Смаляніцы. Тут я магу сказаць: «Хай жыве нямецкая акуратнасць і пунктуальнасць!» — едзе падвода на выезд, значыцца начальства адпусціла, трэба адчыняць браму! Пазней я пытаўся ў цёці, чаму яна паехала. «Бо дурная была, я ж нэ віедала, шчо трэба было зоставаціса, я ж бо мэрговала, нас одпусцілі, эно Маню забралі, а ніэмцы ж ніц нэ сказалі».

Такім было другое маё выратаванне. Усяго са Смаляніцы на селекцыі было пяць сямей. І пасля вайны ніхто не вярнуўся: ні старыя, ні малыя, толькі тыя маладыя, што былі адабраныя для працы. Вярнулася і наша Маня.

***— Што ўсё-ткі адбылося з вашымі бацькамі?***

— Увесь той час у Смаляніцы і некалькі гадоў пасля вайны цёця, як магла, падтрымлівала маю веру ў вяртанне бацькоў: «От, мне якраз Марыя прысьнілаcа, сказала, жджы мэнэ, хутко будэмо дома!.. Вэрнуцца, вэрнуцца, і маці і бацько, я от навэтко до Маланкі сходзіла, коб карты кінула: то сказала, нэ буойтэса — осё воны обое, ужэ ў дорозі дохаты, жджыэ, хутко будут»... А праўду ж ведала: расстралялі іх у 42-м у пружанскай турме.

Праўду я даведаўся ўжо калі жыў у Пружане... А далей былі пытанні: чаму, за што і бясконцыя спробы знайсці адказ, і прошукі адказу ў саміх немцаў, у іх мове, літаратуры, гісторыі, культуры. Але гэта ўжо былі іншыя немцы — не фашысты. Яны і прывялі мяне да перакладу, да «помсты» вось такім шляхам, які я сабе выбраў.



«Белая турма» ў Пружанах, дзе перад смерцю былі бацькі Васіля Сёмухі. Здымак 1950-х гадоў з архіва дырэктара Пружанскага палаца Юрыя Зялевіча

# НЕЛЬГА ЖЫЦЬ З НЯНАВІСЦЮ...

Васіль СЁМУХА

**Прамова з нагоды ўручэння Крыжа кавалера ордэна «За адмысловыя заслугі перад Федэратыўнай Рэспублікай Германія» ў 1991 г. Друкуецца ўпершыню з невялікімі скаротамі.**



Пачну з галоўнага: мае адносіны з Германіяй, яе культурай, літаратурай. Сёння, з вышыні свайго ўзросту і набытага вопыту, я магу сфармуляваць так: гэта і трагедыя майго жыцця, трагедыя непапраўная і незабыўная, — і разам з тым шчасце ад свядомага жадання і рашэння, што таксама прыйшло з жыццёвым вопытам і з дапамогай нямецкай культуры, — стаць вышэй трагедый асабістых. У гэтым сэнс маёй перакладчыцкай творчасці, у гэтым сэнс таго, што я хацеў бы шчыра сказаць і немцам і беларусам: чалавек не можа жыць нянавісцю, чалавеку запаведана жыць з любоўю ў сэрцы.

Гэтая хрысціянская ісціна накольгі простая ў фармулёўцы, настолькі ж і складаная ў рэальным жыцці. Зрэшты, павінен сказаць, нянавісці ніколі не было. Калі я быў малым хлапчом, у душы жыў дзікі страх, комплекс якога не прайшоў дагэтуль, але жыла і разумна падказваная дарослымі вера ў тое, што ўсё абернецца дабром, што лёс адшкадуецца і верне страчанае. У канчатковым выніку ўсё так і абярнулася: не вярнулася толькі бацькаўская ласка, якое мне і сёння не хапае. Але пакуль жыла надзея, выспявала і жаданне спазнаць прычыны людскіх трагедый. Што? Як? Чаму? За што? Тое ж самае біблейнае пытанне, ясна пастаўленае ў Кнізе Ёва: чаму пакутуюць праведнікі, чаму буяе зло? Чаму Бог дапускае гэта?

Магчыма, наіўная дзіцячая цікаўнасць прывяла да ўразумення: канкрэтныя адказы я змагу знайсці, папытаўшыся ў самых немцаў, — а дзеля гэтага патрэбная мова. З гэтага пачалося школьнае знаёмства з нямецкай мовай. А мова, любая мова, скажу я вам, гэта такая штука, Божы дар людзям, што як толькі ёю сур'ёзна зацікавішся, — усё! Алес! Яна цябе не выпусціць з абдымкаў ніколі. Бо гэта сэрца прыгажосці, гармоніі, духоўнага багацця, бясконцага таленту і Божай шчодрасці, з якой сэрца надзелена дабрынёй.

Недзе на пачатку 10 класа, паралельна з рускім перакладам для большай яснасці, я прачытаў і першую частку «Фаўста». Твор мяне ўразіў тады, цяпер я ўжо і не памятаю, чым і чаму. Ведаю толькі, што ў той час я ўчыніў вялікі грэх і злачынства, парушыў Божую запаведзь — не ўкрадзь! Сёння хачу публічна пакаяцца (а пакаянне — яно і ёсць галоўная думка першай часткі «Фаўста»), пакаяцца ў тым юначым злачынстве. Я выпісаў праз Пружанскую бібліятэку з галоўнай Мінскай бібліятэкі томік твораў Гётэ на нямецкай мове. Пад канец карыстання кнігай я акуратна выразаў першую частку «Фаўста», усё прыгладзіў, падклеіў, так, што ніхто нічога і не заўважыў. Гэтая выразка і цяпер у мяне захоўваецца. Думаю, што ўсё далейшае паслужылася пакаянню. Відома, зрабіць так можна было, ужо зацікавіўшыся творам.

А самае першае знаёмства з «Фаўстам» было са слоў дваюраднай сястры, якая чытала кнігу яшчэ да вайны, у вайну кніга прапала, і сястра з гэтай прычыны вельмі моцна бедавала і шкадавала. Чаму? Казала: «Там такая любоў, такая любоў там! Тамэка молодая дзіеўка зьлюбіласа з хлопцэм, які спэрша быў стары, а потым знэнацку помолодзіеў, і ўсэнько вэлосо вэльмі ж хваіно. А потым вона ёму «дала», вуон змайстроваў йуой бастручка, ногі ў рукі дай гэльц! — лататы! А вона ж дзіцятко тое своё ўтопіла, потым муоцно каялаcа, бэдовала, з гора розумом даласа, уся звэласа, а ейыэ за тое посадзілі, але Пан Буог усэнько йуой даровав». Як бачыце, сюжэт няхітры, але, мабыць, ягоны драматызм дастатковы для розуму дзіцяці, так засеў у памяці, што на ўсё жыццё запомніўся, бо такі сутнасць была перададзена правільна. Мабыць, з гэтага ўсё і пачалося...

«Фаўст» Гётэ — гэта здабытак агульначалавечай культуры. У творы ёсць галоўнае, што я знаходжу і ў Бібліі, і што было сфармулявана Гегелем як «барацьба процілегласцяў»: Бог (Дабро) — Д'ябал (Зло). А паміж імі — Божы твор чалавек, у душы якога і адбываецца векавечная бітва. У гэтым і адказ на ўсе дзіцячыя пытанні. У чалавеку, божым творы, перамагаць павінен менавіта Божы пачатак і аснова яго — любоў, а не нянавісць.

Так выспела жаданне перакласці «Фаўста» на мову, якая таксама дадзена майму народу ад Бога...

Даведаўшыся пра ўзнагароду, я заглянуў у энцыклапедыю: што гэта за ордэн. Чытаю: «1951 gestifteter Orden fur besondere Leistungen beim Wiederaufbau» — «Ордэн, заснаваны ў 1951 годзе за асаблівыя заслугі ў аднаўленні».

Гэта «Wiederaufbau» — «аднаўленне, адраджэнне» ўсцешыла мяне, бо ўся мая праца прысвечана адраджэнню Беларусі, а тут так сталася, што яна аказалася карыснай і нямецкаму народу ў адраджэнні Германіі. Якой Германіі? Той Германіі, якая ў свой час выйшла з Трыццацігадовай вайны, страціўшы дзве трэціны свайго народа, і ўсё ж адрадзілася, і якая пасля дала чалавецтву вялікіх мысліцеляў і вучоных, вялікіх паэтаў і пісьменнікаў, вялікіх кампазітараў і мастакоў, без якіх не мысліцца сёння сусветная культура і цывілізацыя. Гэту Германію я заўсёды любіў і люблю, гэта якраз тое, што адпавядае майму разуменню дзяржавы і ролі ў ёй чалавека, дзеля адраджэння яе і маёй Беларусі гатовы працаваць да канца дзён сваіх.

ЛЁСЫ

# ЦІХІЯ ГЕРАІНІ АКУПАЦЫІ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Аднойчы я трапіла ў Музей нямецкага супраціву ў Берліне. Мяне ўразіла, як далікатна тут абыходзяцца з мінуўшчынай народа. Чалавек у гэтым музеі паўстае не як вінцік гісторыі, а як сапраўдная яе каштоўнасць.**

Яркі прыклад — шматкроць павялічаная рэпрадукцыя калектыўнага здымка 1930-х гадоў. Плошча, тысячы людзей, усе ўзнімаюць руку ў фашысцкім салюце. Цэнтр рэпрадукцыі — хлопец у сярэдзіне масы. Ён стаіць, апусціўшы рукі, і смела глядзіць у камеру. «Мы лічым яго «ціхім героем» антыфашысцкага супраціву, — расказвае гід. — Ён не рабіў дыверсій, не друкаваў улётак, але быў не з імі — і гэта галоўнае. Неўзабаве пасля сходу ён праз свае перакананні апынуўся ў канцлагеры».

Чым інтэнсіўней у Беларусі рэпетуюць юбілейны Парад Перамогі, тым больш мне здаецца: грозныя плямістыя танкі надта бесцырымонна адцягваюць увагу натоўпаў на плошчы ад сапраўдных герояў той цяжкай вайны.



Расказаць пра дзяцінства Жанна Баркоўская (нар. 1937) вырашыла дзеля ўнучкі Варвары, якая жыве ў Берліне



Да вайны падпольшчыца Алена Адырэй (1903–1943) працавала тэлефаністкай



Падпольшчыцу Фядору Дорашаву (1902–1943) паплечнікі называлі «цётка Дора»

## Прыватны музей ВАВ

Пра запаснікі Музея Вялікай Айчыннай вайны даўно ходзяць гарадскія легенды. Маўляў, «уся праўда пра вайну» — там, бо супрацоўнікі не маюць ні жадання, ні магчымасці, ні санкцый паказаць грамадскасці ўсе сведчанні нашых Змагання і Перамогі. І таму тыя, для каго гісторыя другой сусветнай — частка лёсу, трымаюць дома свой, персанальны музей. «Прыватны музей» Жанны Баркоўскай надзвычай бедны на экспанаты. У ім адна кніга, пару газетных выцінак і некалькі старых фотакартак.

Жанна Канстанцінаўна — настаўніца рускай мовы і літаратуры на пенсіі. Па тым, як яна перабірае пажоўклыя паперкі, заўважна: да першага інтэрв'ю яна рыхтавалася не менш, чым да першага ўрока. Найперш маральна. Яна — карэнная жыхарка Мінску, дачка і пляменніца сёстраў, закатаваных у 1943 годзе за ўдзел у Мінскім антыфашысцкім падполлі. Але да сённяшняй нашай сустрэчы гэты факт заставаўся яе асабістай справай.

«Мама працавала на вакзале ў афіцэрскай сталоўцы, а цётка хадзіла туды з вёдрамі па мамы. І заўжды брала мяне з сабой. Вяртаючыся ў прыцемках дадому, на Магілёўскую, мы мусілі перайсці рэйкі, што вялі на таварную станцыю. Аднойчы цётка спатыкнулася аб рэйкі і ўраніла вёдры. З вёдзер высыпалася зброя». Так Жанна даведалася, чым, уласна, займаюцца маці і цётка.

## Шафа пасярод вуліцы

Самы першы дзіцячы вобраз пачатку вайны для чатырохгадовай Жанны — шафа пасярод вуліцы, і ўсё ўцякаюць. Сям'я, у якой у чэрвені 1941-га засталіся адны жанчыны, не паспела эвакуявацца і самастойна пакінуць Мінск.

Усяго на вуліцы Магілёўскай засталіся жыць пад акупацыяй тры сястры: Ганна, Фядора і Алена. Фядора Дорашава — цётка Дора — была ўдавой рэвалюцыянера, перакананай камуністкай, і малодшая сястра Алена ва ўсім брала з яе прыклад. Калі ў 1937 годзе ў сям'і Алены і Канстанціна Адырэй, кадравага афіцэра, нарадзілася дзяўчынка, назваць яе хацелі ў гонар Розы Люксембург ці Клары Цэткін. Але ў выніку абралі імя ў гонар трэцяй жанчыны з тагачаснага камуністычнага пантэону — Жанны Д'Арк. Старэйшая сястра Ганна была раскулачанай, і таму сёстры не пасвячалі яе ў свае справы.

Афіцыйна Дора і Ганна займаліся хатняй гаспадаркай, а Алена працавала афіцыянткай у афіцэрскай сталоўцы на Мінскім вакзале. На справе дом па адрасе Магілёўская, 44 быў явачнай кватэрай падпольнай групы Мікалая Кабца і пунктам для перапраўкі зброі ў партызанскі атрад. У іх доме арандаваў кватэру чыгуначнік Вікенцій Шацько з жонкай, кіраўнік падрыўной групы. Ён і яго паплечнікі падкладалі пад вагоны міны і здавалі ў эксплуатацыю няспраўныя цягнікі.

Зброю здабывалі так. Шацько знаходзіў знявечаныя вінтоўкі ды аўтаматы на нямецкай звалцы, перадаваў з сёстрамі дадому і рамантаваў. Цалюткую зброю здабывала Алена. Дзяжурачы па вечарах, яна чакала, пакуль афіцэры нап'юцца ў зюзю, а потым прыбірала іх зброю разам з пустымі пляшкамі. Што цікава, ніхто нічога не падазраваў і начальства не скардзіўся…

«На яе баявым рахунку нямала забітых гітлераўцаў», — напісана пра Алену Адырэй у адной з нешматлікіх крыніц. Як так, пытаюся? Жанна Баркоўская тлумачыць: ёсць звесткі, што, гатуючы ежу для нямецкай палявой кухні, маці падсыпала ў катлы атруту. Але афіцыйна гаварыць пра гэта было не варта: ужыванне атрутных рэчываў падчас другой сусветнай было забаронена Жэнеўскім пратаколам. Пра гэта пасля вайны Жанну папярэдзіла знаёмая журналістка. Але гэтая забарона — не адзінае правіла вядзення вайны, пра якое нават не здагадваліся падпольшчыкі. «Яны зусім страцілі пільнасць», — уздыхае Жанна.

## Выдатнае прыкрыццё

Зброю маленькая Жанна знаходзіла паўсюль — гуляючыся ў прызбе, пад ганкам, у доме. На вокны цётка Дора вешала падвойныя гардзіны — для зацямнення: паліць святло пасля камендантскай гадзіны на акупаваных тэрыторыях было забаронена. Пасярод хаты, на этажэрцы стаяў радыёпрыёмнік (знайшоўшы такі, немцы расстрэльвалі адразу) і каштарская кніга — у ёй Дорашава вяла ўлік падпольных аперацый.

Прачынаючыся, маленькая Жанна магла не прыспець побач нікога са сваякоў, затое бачыла, што ў хаце поўна незнаёмых людзей. Па вечарах госці часта слухалі радыё. Па яе дзіцячых адчуваннях, у падполлі быў цэлы Мінск. Дора і Алена пастаянна хадзілі ў госці. Але ўсё — па справе: вінтоўкі, улёткі, абмен інфармацыяй. І вучылі дзяўчынку нікому не расказваць пра гэтыя візіты. «Я помню, яны часта сварыліся, хто возьме мяне з сабою, — згадвае Жанна. — Цяпер я разумею: маленькае дзіця было выдатным прыкрыццём».

Падпольныя групы СД выкрывала і знішчала пастаянна. Пад пагрозай былі і чыгуначнікі. Сям'я Жанны павінна была сысці ў партызаны, але жанчыны марудзілі…

## Няпафасная праўда

«Трагічным для сясцёр стаў адзін са жнівеньскіх дзён 1943 года. Выконваючы заданне, Алена Адырэй заўважыла, што за ёй сочаць гестапаўцы. Яна паспела дабегчы да дома, схапіла пісталет. Але не хапіла мінуты, каб выкарыстаць зброю. Літаральна на парозе свайго дома гераіня была застрэлена фашыстамі. (…) У дзень гібелі Алены Адырэй была арыштаваная і Дора Дорашава. Яе выдаў здраднік у момант, калі яна распаўсюджвала антыфашысцкія лістоўкі», — пісала газета «Звязда» часоў застою. Адзіная публікацыя, датычная сёстраў Цяцерскіх, падпісаная імёнамі ўдзельніцы Мінскага падполля і навуковай супрацоўніцы Музея ВАВ, поўная чыстай вады галівудчыны і геройскага пафасу.

«Усё было не так, усё было страшней», — гаворыць Жанна. Падпольшчыкі ўвогуле не ўсведамлялі, што робяць нешта выключнае, згадвае яна. Вінтоўкі рамантавалі з той самай руплівасцю, з якой палолі буракі. Чыста чалавечае жаданне здавацца большымі героямі, чым насамрэч, — адметнасць тых, хто выжыў.

«Мы сядзелі ў заднім пакоі, і мама чытала брашуру, даклад Сталіна: неўзабаве падпольшчыкі мусілі прыняць яе ў партыю. Раптам з пярэдняга пакою мы пачулі, як цётка размаўляе з кімсьці на падвышаных тонах. Мама вырашыла, што гэта проста суседская сварка, і не звярнула ўвагі. Раптам у пакой уварваўся незнаёмы мужчына. Маці схавала брашуру пад падушку, а той заўважыў. Выхапіў, зірнуў на вокладку — і стаў біць маці і цётку брашурай па твары. Выявілася, гэта быў супрацоўнік паліцыі. Ён зайшоў у хату, магчыма, са звычайнай праверкай — і адразу ўгледзеў радыёпрыёмнік».

У хату прыйшла суседка па траву для свіней. Ні слова не кажучы, надзела на дзяўчынку (у жніўні) зімовае паліто і шапку і павяла з сабою. Паліцыя ўжо вымала з прызбы зброю. Было зразумела, што гэта арышт.

Суседзі схавалі Жанну ў падвал, дзе яна цэлы вечар чула крыкі з роднага дому. Паліцаі замардавалі Алену Адырэй і выставілі цела на падворак у скрыні. Дору адвезлі ў турму СД, дзе яна пазней загінула падчас катаванняў.

Па падвалах у розных суседзяў шасцігадовую дзяўчынку хавалі каля двух тыдняў, пакуль ёй цікавілася СД. Каб тая не плакала, прыносілі пагуляцца жывых трусікаў — шэрых, з чырвонымі вачыма. «З тых часоў трусоў я ненавіджу», — кажа Жанна.

Калі ўсё сціхла, суседка Алена Лычкоўская адвяла яе ў Чыгуначную царкву на Маскоўскай вуліцы (пасля вайны храм зруйнавалі) і ахрысціла. Тут да самага вызвалення дзяўчынка знаходзілася цэлымі днямі, як у садочку: у храмах фашысты не забівалі і не арыштоўвалі.

## «Маршал Жукаў узяў Берлін»

У 1945-м дзяўчынку забраў бацька, які з 1941 году знаходзіўся ў канцлагеры. Праз два гады ён памёр ад сухотаў, але каб і выжыў — лёс яго быў незайздросны: праз пару дзён па смерці яго як былога ваеннапалоннага прыйшоў арыштоўваць НКУС. Гадавала Жанну цётка Ганна, якой у той страшны дзень, на шчасце, не было ў горадзе.

У 1944-м дзяўчынка пайшла ў школу і ў маі 1945-га ўжо ўмела пісаць. «Мяне выклікалі да дошкі, бо маю прыгожы почырк, і папрасілі напісаць: Маршал Жукаў узяў Берлін. Я пісала, адчуваючы з гонарам: у гэтым — заслуга і маіх родных», — успамінае Жанна.

Але гісторыкі памеркавалі інакш. Дзякуючы сям'і падпольшчыкаў Шацько, здымкі сясцёр з вуліцы Магілёўскай пэўны час віселі ў экспазіцыі Музея ВАВ, але хутка адтуль зніклі. Калі сын Дорашавай, франтавы лётчык, і Жанна пайшлі даведацца, у чым прычына, у ЦК КПБ у іх з парога са здзекам спыталіся: «Што, льгот захацелася?» Пасля чаго дзеці падпольшчыц развярнуліся і сышлі: хацелася не льгот.

## Міністэрства ветэранаў

Пасля Вялікай Айчыннай яе ўдзельнікаў стала вельмі шмат. Большасць людзей гэта жангляванне даведкамі раздражняла: усіх «сыноў палка» і «дзяцей падполля» лічылі круцялямі ды халяўшчыкамі. А тут яшчэ нехта з суседзяў сказаў: «Сядзелі б твае ціха, як мы, — былі б цяпер жывыя». Таму Жанна нідзе не заяўляла пра сваю сям'ю. На пытанне, чаму ж цяпер Жанна Канстанцінаўна вырашала гаварыць пра мінулае, яна адказвае: «Дзеля ўнучкі».

Праз тое, што ўсе сваякі загінулі, Жанна не ведае сваіх каранёў. І таму хоча, каб дачка Алена, якую назвалі ў гонар бабулі, і ўнучка Варвара ведалі гісторыю сям'і. І ганарыліся.

Дачка з унучкай жывуць у Берліне, за пару кварталаў ад Рэйхстагу. Прыязджаючы ў госці, Жанна спакойна ставіцца да немцаў, спакойна чуе іх мову: «Войны завязваюць асобы, а не народы». Вось толькі ў Рэйхстаг яна адмаўляецца заходзіць, бо для яе гэта сімвал нацызму. І яшчэ — гэта ўжо ў Мінску — раней яе калаціла падчас салютаў, бо па гуку яны нагадваюць бамбёжку. І фільмы пра вайну глядзець не магла. Прайшло гэта, толькі калі яна пераехала з вуліцы Магілёўскай.

У Францыі ёсць Міністэрства ветэранаў, гаворыць Жанна. У Беларусі любяць пышныя, у стылі Трэцяга рэйху, парады і гучныя словы, за якімі не заўважна галоўнага — асобы. Заходні тэрмін «ціхі герой» набывае ў кантэксце айчыннай гісторыі іншае значэнне. Ціхія героі — тыя, пра чые без усялякіх нацяжак выключныя подзвігі не крычаць у гукаўзмацняльнікі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# «SCORPIONS» ПАДАРАВАЛІ МІНЧУКАМ САПРАЎДНАЕ СВЯТА

Генадзь КЕСНЕР

**У перадапошні дзень красавіка на «Мінск-Арэне» ўсё ж адбыўся доўгачаканы выступ легендарнай нямецкай рок-каманды «Scorpions», цікавасць да якога выявілі больш за 11 тысяч гледачоў — прадстаўнікоў усіх пакаленняў.**



Як старэйшага, што не дзіўна, бо заснаваныя «Скарпы» былі Рудольфам Шэнкерам (Rudolf Schenker) яшчэ ў далёкім 1965 годзе — 45 гадоў таму!), так і зусім маладых фанаў «Scorpions», якіх толькі на фан-пляцоўцы ды ў танц-зоне было некалькі тысяч.

Мінскі выступ легенды сусветнай рок-музыкі 29 красавіка адбыўся ў межах развітальнага туру «Get Your Sting and Blackout». Чарга да «Мінск-Арэны» выбудавалася яшчэ задоўга да пачатку канцэрта. Ужо за некалькі гадзін было складана прыпаркавацца тым, хто прыехаў на ўласным аўто, праблемы ўзнікалі нават у тых, хто карыстаўся паслугамі таксоўкі.

Было крыху дзіўнавата, што арганізатары вырашылі адчыніць для ўваходу толькі сектары «А» і «С» (хоць у наяўнасці — чатыры «КПП»), гэтым і тлумачылася тое, што некаторым гледачам давялося даволі доўга чакаць сваёй чаргі, каб трапіць на тэрыторыю «Мінск-Арэны». Плюс яшчэ прайсці праз працэдуру дагляду (выкласці рэчы з кішэняў, прадаставіць на агляд змесціва кейсаў, барсетак і валізак, а потым пракрочыць праз металашукальнік).

Ну, захады бяспекі ў наш няпросты час ёсць рэч важная і неабходная — як той казаў, беражонага Бог аберагае. Варта дадаць, што тыя адмыслоўцы, што ажыццяўлялі кантроль публікі на ўваходах, былі вельмі ветлівыя, папераджальныя і ўвогуле «прыемныя ва ўсіх адносінах людзі».

Гэтыя вось захады перасцярогі і паспрыялі таму, што канцэрт пачаўся на 45 хвілін пазней за абвешчаны час — музыкі, відаць, паклапаціліся пра тое, каб усе змаглі патрапіць у залу. Але з'яўленне на подыуме Клаўса Майнэ (Klaus Meine) і кампаніі хутка прымусіла прысутных забыцца на не зусім прыемныя хвіліны зацягнутага чакання.

З першых жа акордаў стала зразумелым, што на сцэне — сапраўдныя майстры сваёй справы. Мне давялося прачытаць у нейкім выданні, што, маўляў, гук быў занадта моцны, а ў аўтара таго крытычнага артыкула нібыта «кашуля варушылася на целе». Не ведаю, дзе знаходзіўся той аўтар, але мне падалося, што якраз гук быў файным (гэта пацвердзіў і адзін мой сябра-гукарэжысёр з больш як трыццацігадовым досведам працы на радыё і з рок-гуртамі).

Карацей, гук быў прыстойным, подыум — таксама, хоць без якіх там піратэхнічных выкрунтасаў, як тое мела месца падчас нядаўняга выступу на гэтай жа сцэне суайчыннікаў «Скарпоў» — гурту «Рамштайн». Высокая якасць выступу, а таксама кампазіцыі, якія даўно палюбіліся мільёнам фанаў гэтага калектыву, кампенсавалі адсутнасць звышсучаснага асвятляльнага абсталявання і мудрагелістых спецэфектаў. «Still Loving You», «Wind of Change», «Holiday», «Hurricane» і яшчэ больш за дзесятак найвядомейшых твораў гурта даводзілі публіку літаральна да экстазу.

Дарэчы, яшчэ на пачатку канцэрту, пасля дзвюх кампазіцый, неўгамонны саліст «Скарпоў» Клаўс Майнэ нарэшце звярнуўся да гледачоў. Ды як! «Мінск, як настрой?» — менавіта так, па-беларуску запытаўся выбітны спявак! Фанаты аддзячылі куміраў аглушальным ровам. Потым Клаўс Майнэ яшчэ не аднойчы казаў «Дзякуй» сваім верным фанатам, якіх пастаянна адорваў бубначовымі стукалкамі. Але апагеем стаў момант, калі музыкі разгарнулі расцяжку на надпісам «Scorpions», выкананую ў колерах дзяржаўных сцягоў Беларусі і Германіі — во тут было крыку ды эмоцыяў!

Дарэчы, гледачы вельмі цёпла прымалі нямецкіх артыстаў: здзіўляла тое, наколькі добра нашы суайчыннікі ведаюць «матэрыял» — як толькі саліст змаўкаў і кіраваў мікрафон у залю, тут жа песню стройна і прыгожа падхоплівалі тысячы галасоў. І словы ж ведаюць! Гэтыя абставіны вельмі ўзрадавалі саміх выканаўцаў, таму «Scorpions» яшчэ не аднойчы звярталіся да гэтага файнага прыёму працы з публікаю.

Асобным момантам канцэрту было выкананне кампазіцыі без слоў, калі нават Клаўс Майнэ ўзяў у рукі гітару — гэта было сапраўды цудоўна. А бубнач Джэймс Котак (James Kottak) уразіў усіх філіграннай тэхнікай, фантастычным выступам сола ў той час, калі яго калегі па калектыву ўзялі некалькі хвілін паўзы, каб перавесці дыханне. Дарэчы, менавіта з-за таго, што гэты геніяльны майстар перкусіі не змог прыляцець у Еўропу са Злучаных Штатаў з прычыны буйства ісландскага вулкану, быў адкладзены на 29 красавіка канцэрт «Скарпоў», што мусіў адбыцца 20 красавіка.

І ўсё ж яшчэ адзін момант, нават не момант, а цэлая з'ява, якая мяне ўразіла, прычым вельмі прыемна. Упершыню я ўбачыў «Scorpions» у Мінску ў сярэдзіне 1990-х гадоў. Тады мне нават пашчасціла зрабіць з Клаўсам Майнэ невялікае інтэрв'ю для «Радыё 101,2 FM» (адмысловая падзяка за тагачаснае спрыянне ў гэтай цяжкой справе Аляксандру Памідораву!), дзе на той час я працаваў ды-джэем. Дык вось, даводзілася мне з працяглымі інтэрваламі ў іх дзейнасці бачыць жыўцом і легендарных немцаў з «Accept», і прывабных і меладычных шведаў з гурту «Еўропа». Дык з цягам часу выбітныя галасы выдатных вакалістаў Уда Дыркшнайдэра і Джоя Тэмпэста, на жаль, страцілі сваю былую моц і чысціню. Гэта і не дзіва — маладзейшымі ні зоркі, ні мы з вамі з бегам часу не робімся. А вось з Клаўсам Майнэ ўсё наадварот — мне падалося, што голас лідэра «Скарпоў» стаў яшчэ больш чыстым і моцным. І не толькі ў мяне склалася такое ўражанне. Сапраўднае дзіва…

Гледачы доўга не хацелі адпускаць з подыуму сваіх куміраў. І тыя адплацілі сваім мінскім фанам удзячнасцю за цярплівасць (у звязку з пераносам канцэрту), выканаўшы яшчэ некалькі хітоў са свайго вялікага і бясцэннага рэпертуару. І неяк цяжка ўсведамляць, што выступ у беларускай сталіцы легендарных «Scorpions» быў, відаць, апошнім у Беларусі, і для большасці тых, хто прыйшоў 29 красавіка ў «Мінск-Арэну», гэта была фінальная магчымасць атрымаць асалоду ад жывога выступу сваіх улюбёнцаў. Як гэта ні сумна, але даводзіцца прымаць да ведама: гэты гастрольны тур «Скарпоў» «Get Your Sting and Blackout», няхай ён і зацягнецца на некалькі год, але ўсё ж развітальны. Дзякуй, «Scorpions»!







Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 412
Падпісана да друку 07.05.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.